ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 58 (2111)
19 ліпеня 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАРАЧАНСКІ СЕМІНАР ЗАКОНЧЫЎ РАБОТУ

Закончыў сваю работу рэспубліканскі семінар творчай моладзі, які праходзіў на беразе славутай Нарачы.

У перадапошні дзень семінара, пасля абмеркавання праблем развіцця сучаснай беларускай музыкі, маладыя літаратары і выканаўцы наладзілі вечар для адпачываючых у доме адпачынку «Нарач». На ім выступілі паэты Ул. Паўлаў, Я. Янішчыц, В. Іпатава, Ю. Свірка, А. Грачанікаў, Г. Бураўкін, Б. Лазавой (Масква), цымбаліст А. Лявончык, спевакі Л. Каспорская, Ф. Севасцьянаў, Т. Раеўская, баяніст С. Сакалоў, кінаартыст Ул. Паначэўны, кампазітар Д. Смольскі, піяністка В. Лагвіненка.

Апошні дзень семінара быў прысвечаны тэме «Камсамол і творчая моладзь». Пасля ўступнага слова сакратара ЦК ЛКСМБ А. Ваніцкага ўдзельнікі семінара абмяняліся думкамі аб новых кірунках у рабоце камсамола, аб удзеле маладых літаратараў, кампазітараў, мастакоў, кінематаграфістаў у выхаванні моладзі.

Вечарам удзельнікі семінара гутарылі з кіраўнікамі Мядзельскага раёна — сакратаром РК КПБ А. Жданюком, старшынёй райвыканкома В. Дубовікам, сустрэліся з сакратарамі ЦК ЛКСМБ Г. Жабіцкім і Л. Крукавым.

ДНЯПРОЎСКАЯ ЦВЯРДЫНЯ

У цэнтры Магілёва высіцца помнік-абеліск Герою Савецкага Саюза генералу Лазарэнку, які загінуў у баях за вызваленне горада. Сюды прынеслі кветкі былыя абаронцы Магілёва Герой Савецкага Саюза Р. Ганчар і В. Кузняцоў.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

Магілёў сёння ў сакавітай лістоце дрэў. Ліпень. Гарачы, сонечны, з высокім блакітным небам. Такі, як і той далёкі ліпень сорак першага года.

Дваццаць пяць год сплыло з той пары. Дваццаць пяць год назад ля сцен старажытнага горада на Дняпры кіпеў смяротны бой.

І сёння, калі ва ўсіх падрабязнасцях стала вядома абарона Магілёва, мы параўноўваем яе з Брэсцкай эпапеяй. Толькі тут ужо не нізкія скляпенні казематаў, а шырокі дняпроўскі прастор і дзесяткі тысяч людзей, што дваццаць тры дні біліся насмерць, перамалваючы жывую сілу і тэхніку ворага ў глыбокім тыле яго—фашысты тады ўжо ўзялі Смаленск і рушылі на Маскву...

Гэтыя мясціны пад Магілёвам сталі сапраўды векапомнымі. Вёска Буйнічы. Тут яшчэ і сёння цягнецца глыбокі процітанкавы роў, выхапаны абаронцамі Магілёва. На буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 года адбылася бітва, якая завяршылася перамогай нашых войск, бітва, якую пісьменнік Канстанцін Сімонаў апісаў у рамане «Жывыя і мёртвыя». На буйніцкім полі немцы пакінулі 39 сваіх танкаў, падбітых савецкімі воінамі.

Цішоўка, Бутрымаўка, Струшні, Сідаравічы... Гэта ўсё пад самым горадам, кожная пядзя зямлі тут густа паліта крывёю. Кожная з гэтых мясцін варта таго, каб быў тут пастаўлены помнік з граніту і мармуру, які б усяму свету расказваў пра адвагу і мужнасць тых, хто стаяў насмерць.

...Магілёў адзначае дваццаць пятую гадавіну сваёй абароны. Бясконцы паток людзей з жывымі кветкамі ў руках ідзе і ідзе да помнікаў загінуўшым воінам. На цэнтральнай плошчы горада, у парку, у скверах вывешаны партрэты абаронцаў Магілёва, якія сваім ратным подзвігам праславілі горад.

Шматлюдны мітынг адбыўся ля абласной бальніцы. Тут была адкрыта мемарыяльная дошка, прысвечаная подзвігу трох ваеннурачоў — Кузняцова, Паршына і Пашаніна, якія, рызыкуючы жыццём, у час акупацыі Магілёва выратоўвалі раненых савецкіх байцоў, перапраўлялі іх у лес да партызан. Фашысты жорстка расправіліся з патрыётамі.

Вечарам 16 ліпеня Зялёны тэатр горада запоўнілі прадстаўнікі працоўных горада, воіны Савецкай Арміі, шматлікія госці. Яны сабраліся на ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае знамянальнай даце. Першы сакратар гаркома партыі Г. Бадуноў, які адкрыў яго, выступіўшыя — былы камісар 172 дывізіі Л. Чарнічэнка, былы кулямётчык гэтай дывізіі Ул. Пяткоў, былы апалчэнец В. Сырамалотаў, удзельніца падполля М. Базылёва і іншыя гаварылі пра мужнасць абаронцаў Магілёва, пра іх непахісную волю да перамогі, пра тое, што ніколі ў памяці народнай не згасне любоў да тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля нашага сённяшняга светлага дня.

ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАГА КІНО

СВЯТЛО ДАЛЁКІХ ЗОРАК

Вольга НЯЧАЙ

Расказваюць, што калі на фестываль беларускага мастацтва ў Расіі спатрэбілася паслаць артыстаў кіно, работнікі кінематаграфіі разгубіліся. Сапраўды, дзе іх узяць, беларускіх артыстаў кіно? Здымаецца ў нашых фільмах шмат хто; але, як правіла, гэтыя людзі прамых адносін да рэспублікі не маюць. Кажуць, кінематаграфісты ўрэшце знайшлі выйсце. Маскоўская актрыса Любоў Румянцава перад гэтым стала жыхаркай Мінска, — паслалі яе. У Кемерава паехала таксама выканаўца эпізадычных роляў Нэлі Жукоўская, а пасля з Масквы запрасілі Станіслава Любшына...

Як жа гэта здарылася, што беларуская кінематаграфія аказалася кінематаграфіяй без акцёраў, што ў нас не стала сваіх артыстычных кадраў і мы вымушаны шукаць іх на старане?

У пяці апошніх карцінах, зняты на «Беларусьфільме», — звыш 30 галоўных роляў. Толькі тры з іх, прычым не галоўныя, былі даверены беларускім акцёрам. Гэтыя тры ролі плюс тры ролі школьнікаў і складаюць актыўны баланс рэспублікі. Астатніх выканаўцаў работнікі студыі шукалі дзе толькі можна. Былі запрошаны артысты з Казані, Адэсы, Ленінграда, з тэатра-студыі «Сучаснік», Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола, Студыі кінаакцёра імя М. Горкага, Тэатра імя Вахтангава, «Масфільма», Горкаўскага ТЮГа, Маскоўскага тэатра драмы і камедыі і шмат адкуль яшчэ.

У кіно — свая спецыфіка, і рэжысёры, вядома, маюць права выбіраць акцёраў, запрашаць тых, якія ім больш падыходзяць.

Але давайце разбяромся, чаму запрашэнне акцёраў са стараны стала ў нас ледзь не нормай, ці няма тут, акрамя спецыфічных, і іншых прычын.

Студыя «Беларусьфільм» перажыла за апошнія гады бурны працэс абнаўлення кадраў. У беларускае кіно прыйшлі маладыя рэжысёры В. Тураў, Б. Сцяпанаў, Ул. Бычкоў, І. Дабралюбаў і іншыя. На творчым рахунку маладых пастаноўшчыкаў ёсць ужо і пэўныя ўдачы, іх работы ўсё больш пачынаюць вызначаць аблічча студыі. Але бяда ў тым, што маладыя рэжысёры мала знаёмы з беларускім тэатральным мастацтвам, з нашымі артыстычнымі кадрамі. Баючыся рызыкі, страхуючы сябе, яны часта запрашаюць на галоўныя ролі артыстаў, якіх добра ведаюць, альбо тых, што стварылі аналагічныя вобразы ў фільмах іншых рэжысёраў. У мастацтве капіраванне ніколі не вядзе наперад, і менавіта таму не «прагучаў» у нас у ролі беларускага настаўніка артыст Э. Павулс («Крыніцы»). Няўдалы выбар выканаўцы на ролю Івана Цярэшкі прывёў да таго, што многае аказалася «недасказаным» у такім у цэлым цікавым фільме, як «Альпійская балада». А ўспомнім, як няўдала выступіла Р. Ніфантава пасля поспеху «Сёстраў» у нашым фільме «Дзень, калі спаўняецца трыццаць год». Або правал С. Паўлавай у фільме «Наперадзе круты паварот» пасля бліскучага дэбюту ў «Камунісце».

Можна, праўда, нагадаць і асобныя выключэнні. Ул. Белакураў, напрыклад, стварыў даволі цікавую ролю ў фільме «Праз могілкі». Але гэта была ўсё ж такі роля «агульнага плана», роля, пазбаўленая канкрэтных рысаў, нацыянальнага характару. Я ўпэўнена, беларускі акцёр знайшоў бы для яе і неабходны каларыт, і характэрныя фарбы, а фільм у цэлым толькі б выйграў.

Варта нагадаць, што і для «Несцеркі» ў нас чамусьці палічылі неабходным запрасіць акцёра са стараны, прычым яўна не таго плана. Нават на галоўных ролях у «Першых выпрабаваннях», створаных па коласаўскіх «На ростанях», здымаліся не нашы артысты. Не ведаючы асаблівасцей побыту беларускай вёскі, яе мінулага, яны, натуральна, не маглі як след ужыцца ў вобразы. А між тым права на коласаўскую тэму літаральна выпакутавалі артысты Тэатра імя Якуба Коласа, дзе з поспехам ішла «Навальніца будзе» (прыгадаем хаця б Ф. Шмакава ў ролі Каля)...

Вось зусім свежы факт. На галоўную ролю ў фільме «Саша-Сашанька» запрошана маладая маскоўская артыстка Н. Селязнёва. Тэатр, у якім яна працуе, выязджае на гастролі ў Прыбалтыку. І здымачная група збіраецца за тэатрам услед, бо актрыса не згодна «адлучацца». Не ведаю, ці прынясе поспех фільму падарожжа па маладую зорку, але што яе ролю з поспехам магла б выканаць наша актрыса, прычым не давялося б ехаць у далёкую дарогу, — у гэтым няма сумнення.

Агаваруся адразу. Не ўсе фільмы, тут названыя, зняты маладымі рэжысёрамі. «Крыніцы», напрыклад, ставіў І. Шульман, «Першыя выпрабаванні» — Ул. Корш-Саблін. Ды ў тым і бяда, што некаторыя нашы старэйшыя рэжысёры таксама пачалі гнаціца за далёкімі зоркамі, забыліся, што мы самі маем цікавейшыя акцёрскія сілы.

Работа нашых здымачных калектываў была б куды больш паспяховай, калі б беларускія рэжысёры не адкрывалі ўжо даўно адкрытае, калі б яны імкнуліся знаёміць уссаюзнага гледача з лепшымі работамі сваіх, беларускіх артыстаў.

Як выкарыстоўваюць нацыянальныя кадры на іншых кінастудыях, ці пануе і там такая абякавасць у адносінах да сваіх акцёраў?

Грузінскія кінематаграфісты пазнаёмілі нас нядаўна з таленавітым Серго Закарыядзе. Артыста, якога раней ведалі толькі ў Грузіі, цяпер ведае ўвесь свет. За выкананне галоўнай ролі ў фільме «Бацька салдата» С. Закарыядзе атрымаў Ленінскую прэмію.

Прэмія Ленінскага камсамола прысуджана літоўскаму фільму «Ніхто не хацеў паміраць». Рэжысёр В. Жалакявічус не пабаяўся запрасіць для здымак акцёраў малавядомага за межамі Літвы Панявежскага тэатра — і які поспех! Мы запомнілі таксама таджыкскі фільм «Спаборніцтва», эстонскі «Крыгаход». Прычына поспеху гэтых стужак і ў тым, што вобразы галоўных герояў увасобілі ў іх таленавітыя нацыянальныя акцёры.

А ці ёсць падобныя прыклады ў нашым кіно?

У 30-я гады вялікім поспехам карыстаўся беларускі фільм «Двойчы народжаны». Галоўную ролю ў ім выконваў акцёр БДТ-1 Уладзімір Крыловіч. Фільм захаваўся, і, гледзячы яго, мы і цяпер любуемся таленавітай ігрой артыста, які так праўдзіва перадаў тыповыя рысы чалавека з народа.

У пасляваенных беларускіх карцінах з поспехам выступалі Г. Глебаў, Ул. Дзядзюшка, Л. Ржэцкая, В. Пола, Л. Рахленка. Фільмы з іх удзелам, можа, і былі недасканалыя па сцэнарыях, але вартасці карцін, іх права на экраннае жыццё якраз у многім і вызначаюцца непаўторнай ігрой гэтых акцёраў.

Нядаўна Беларускае тэлебачанне, а затым і Тэатр імя Янкі Купалы паказалі інсцэніроўкі па раману І. Мележа «Людзі на балоце». У пастаноўках яшчэ раз выявіўся талент старэйшага і малодшага пакаленняў купалаўцаў. Як удзячны былі б кінематаграфістам гледачы, калі б мы ўбачылі падобны фільм на вялікім экране, прычым з удзелам акцёраў, якія палюбіліся ўжо нам.

Але, можа, беларускія акцёры не «кінагенічныя», можа, яны не падыходзяць для здымак?

Гэта не так.

Беларускіх акцёраў здымаюць, і здымаюць ахвотна... на чужых студыях.

М. Яроменка іграў галоўную ролю ў фільме С. Герасімава «Людзі і звяры». На студыі імя Даўжэнкі шмат здымалася Т. Аляксеева. У карцінах «Адзінота», «Людзі на мосце», «Хлеб і ружы» і іншых мы бачылі Г. Глебава. Галоўную ролю ў фільме «Аварыя» выканаў В. Тарасаў (артыст, безумоўна, мог стварыць нямала і іншых цікавых вобразаў маладых сучаснікаў, але, на жаль, у кіно час для яго згублены, і тут яму патрабуюцца ўжо ролі іншага плана). На «Ленфільме», Адэскай студыі паспяхова здымаўся Р. Філіпаў, артыст своеасаблівы, глыбокага даравання. На экраны хутка выходзіць новы фільм з яго ўдзелам — «Тры таўстуны» («Ленфільм»). А вось на «Беларусьфільме» Р. Філіпаву дазяваюць толькі дазначныя, эпізадычныя ролі. Размётнава ва «Узнятай цаліне» з поспехам сыграў народны артыст БССР Ф. Шмакаў. Мы бачылі яго таксама ў вялікіх ролях у фільмах «Балтыйскае неба», «Інтэрнацыянал». З Шмакава быў бы і цудоўны Несцерка, але...

Дык, значыць, артысты ў нас ёсць, ёсць каго здымаць, толькі няма, як кажуць, прарока ў сваёй айчыне.

У Беларусі 11 прафесіянальных і 30 народных тэатраў. Тут шмат таленавітай моладзі. У Віцебскім драматычным тэатры, напрыклад, больш паловы акцёраў — моладзь. На сцэне з поспехам працуюць выпускнікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Валерый Анісенка, Уладзімір Куляшоў, Святлана Некіпелава, Вілета Кліменка, Ніна Левашова. Па некалькі галоўных роляў сыгралі ўжо ў спектаклях Гродзенскага тэатра маладыя акцёры Нэлі Быкава і Віктар Рубан. У Брэсце добра паказалі сябе Валянцін Варонін, востра характарны камедыйны акцёр Валянцін Трацціякоў. А тэатральная моладзь Мінска? Варта назваць толькі імёны: Лілія Давідовіч, Генадзь Гарбук, Аўгуст Мілаванаў, Зінаіда Зубкова, Марыя Захарэвіч, Павел Дубашынскі, Міхась Пятроў... Некаторых з іх мы ўжо бачылі ў тэлевізійных пастаноўках і пераканаліся, што гэта акцёры, безумоўна, «кінагенічныя» (успомнім Л. Давідовіч і Г. Гарбука ў «Людзях на балоце»). Толькі ў эпізадычных ролях здымаецца пакуль што ў кіно Тоня Бендава, а гэта актрыса вельмі своеасаблівая, вартая большай увагі рэжысёраў.

У тэатральным інстытуце паспяхова займаюцца Ул. Макараў, В. Рыжы, Л. Корхава, А. Шагідзевіч. Да іх варта прыгледзецца кінарэжысёрам. Вядома, гэта яшчэ толькі студэнты, але прыгадаем, што і герояў «Балады пра салдата» сыгралі першакурснікі. На жаль, творчае жыццё тэатральна-мастацкага інстытута адарвана ад жыцця кінастудыі. Студэнты, праўда, ходзяць на масоўкі, але тут яны часцей бачаць толькі кінематаграфічную кухню, адваротны бок медаля.

У нас да гэтага часу не наладжаны як след творчыя сувязі паміж тэатрамі і кіно. Работнікі тэатраў і кіно часта працуюць, не ведаючы адзін аднаго. Нешта не відаць, каб кінарэжысёры ўдзельнічалі ў абмеркаванні тэатральных спектакляў, а Саюз кінематаграфістаў, у сваю чаргу, не запрашае работнікаў тэатра на абмеркаванне новых фільмаў.

У кінематаграфістаў і акцёраў паявілася зараз магчымасць сустракацца пад адным дахам — пачаў сваё жыццё Дом мастацтваў. Будзем спадзявацца, што суседства дзвюх муз перарасце ў супрацоўніцтва — на карысць і тэатру, і кіно.

Але акцёрскую праблему сустрэчамі не вырашыш. Нястача акцёрскіх кадраў, відаць, усё больш адчуваецца і на студыі «Беларусьфільм». Тут нават выдалі спецыяльны загад № 85 «Аб больш глыбокім прыцягненні беларускіх акцёраў да ўдзелу ў новых фільмах». У званы ўдарылі, ды зноў не ў тыя. «Іншагародніх акцёраў запрашаць толькі на галоўныя ролі, — гаворыцца ў загадзе, — а ўсе эпізадычныя ролі і агучванне праводзіць у асноўным мясцовымі сіламі». Таварышы дарагія, дык гэта ж тое самае і нават не надаварот! Загад па сутнасці нацэльвае рэжысёраў на выкарыстанне чужых акцёраў, «апрабіраваных» у іншых студыях, і ў той жа час закрывае дарогу для пошукаў у сябе «дома». Дык хто ж змірыцца з тым, што нашым артыстам адводзяць другарадную ролю?

На «Беларусьфільме» схільны апраўдаць непрывабнае становішча з кадрамі акцёраў у беларускім кіно спасылкамі на тое, што лепш запрашаць таленты са стараны, чым вазіцца з «пасрэднасцямі» ў сябе дома. Але пасрэднасці не патрэбны ні свае, ні чужыя! І мы за таленты, але за тое, каб іх старанна вырошчвалі, не давалі «друздзіцца на пыл». Талентамі «багата адороны мілы край наш», трэба толькі іх бачыць!

Акцёрская праблема, праблема кадраў — адна з галоўных цяпер для беларускага кіно. У нашай кінематаграфіі будзе сваё сапраўды яркае аблічча, калі яна, шукаючы сваіх герояў, знойдзе і сваіх акцёраў, акцёраў, якія прынясуць ёй і новую славу.

Сяргей ВАКАР. Статуя «Максім Багдановіч».

(З дыпломных работ Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

КАНЦЭРТЫ ТРАКТАРАЗАВОДЦАЎ НА «ГОМСЕЛЬМАШЫ»

Моцная дружба звязвае калектывы заводаў — Мінскага трактарнага і «Гомсельмаша». Яны ўжо некалькі гадоў спаборнічаюць, абменьваюцца дэлегацыямі, перадавым вопытам.

А днямі ў гасцях у працаўнікоў «Гомсельмаша» пабывала народная харавая капэла Палаца культуры трактаразаводцаў. Самадзейныя артысты выступілі з канцэртам спачатку ў лідейным цэху, затым у інструментальным. Тут гучалі беларускія народныя і сучасныя савецкія песні, арыі з опер, рамансы. Асабліва цёпла ліцейшчыкі і інструментальшчыкі сустрэлі салістаў Паліну Бандзюк, Розу Бяссмертную, Васіля Трацюка і Барыса Габерніка.

Артысты трактарнага завода запрасілі да сябе ў госці самадзейных артыстаў з «Гомсельмаша».

НА ГАРАДСКОЙ ПЛОШЧЫ

На плошчы Перамогі ў Гомелі экспануецца вялікая выстаўка, прысвечаная 50-годдзю Савецкай улады. Яна складаецца ў асноўным з дакументальных фатаграфій і матэрыялаў, якія ахопліваюць перыяд з 1917 года па сённяшні дзень. Вялікую цікавасць маюць здымкі, зробленыя ў 1917—1918 гадах. На іх адлюстраваны падзеі станаўлення Савецкай улады на Гомельшчыне, барацьба з контррэвалюцыйным мяцяжом. Шырока паказаны гады калектывізацыі, сацыялістычнага будаўніцтва. Некалькі стэндаў расказваюць пра гераічную барацьбу гамяльчан з гітлераўскімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Выстаўка шырока асвятляе таксама пытанні развіцця прамысловасці, калгаснага будаўніцтва і культуры Гомельшчыны.

І. ПЯТРОЎ.

НА ВОСЬМАЙ АКАДЭМІЧНАЙ

На традыцыйнай выстаўцы твораў членаў Акадэміі мастацтваў СССР выстаўлены работы мастакоў, чыя творчасць звязана з Беларуссю.

Многія наведвальнікі спыняюцца ля жывапісных партрэтаў, створаных Ф. Мадоравым. Сярод іх — партрэт Героя Савецкага Саюза, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Васіля Іванавіча Казлова і былога партызана, камандзіра партызанскай брыгады С. Сідарэнкі.

Экспанаваны скульптурныя партрэты З. Азгура, створаныя ім у 1964—1965 гадах: «Янка Маўр», «А. Цюрупа», «А. Бондар», «І. Бардышава», «Паўлюк Багрым».

НА СТЭНДЗЕ — ГЕРОІ-ЗЕМЛЯКІ

Многа мужных людзей жыве ў саўгасе «Клічаўскі». У гады Вялікай Айчыннай вайны яны здзейснілі нямала гераічных подзвігаў на франтах, у атрадах народных мсціўцаў.

Загадчыца мясцовай бібліятэкі Марыя Савельеўна Антонава арганізавала збор матэрыялаў аб земляках—удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. На спецыяльным стэндзе, аформленым у бібліятэцы, сабрана звыш 30 фотакартак былых воінаў і партызан.

М. ЦІШКОЎ.

Клічаўскі раён.

ВЕЧАРЫ, ПОЎНЫЯ РАМАНТЫКІ

У гэтым двухпавярховым будынку жыццё не заціхае ні днём, ні вечарам. Удзень сюды часцей за ўсё прыходзяць дзеці, а вечарамі гасцяваць дарослыя. Для кожнага тут знаходзіцца занятак па душы. Клуб саўгаса «Вейна» — сапраўдны культурны цэнтр вёскі. У яго шматлікіх пакоях чыста, утульна, прыгожа. Святыня клуба — пакой баявой славы. На стэндах «Героі — нашы землякі» і «Памятайце тых, хто загінуў у баях за Радзіму» змешчаны фотаздымкі і кароткія расказы пра тых, кім заслужана ганарацца вейнянцы. Да вайны бухгалтарам у саўгасе працаваў Цімафей Сцяпанавіч Лабанок. Калі фашысты напалі на нашу Радзіму, салдат Лабанок пайшоў на фронт і аддаў сваё жыццё за вызваленне роднага краю. А вось фотаздымкі піянераў Стасіка Берасневіча і Петруся Ларчанкі. Юным ленінцам было па дзесяць год, калі яны выконвалі адказныя даручэнні партызан. Малыя разведчыкі трапілі ў засаду і загінулі як сапраўдныя героі. Больш за дваццаць здымкаў на стэндах, і кожны з іх — гісторыя кароткага, але слаўнага жыцця патрыёта.

ных гара... ва абаро... ны СССР, каб выявіць герояў-вейнянцаў, якія загінулі ў дні вайны.

Славіц... ца клуб сваімі вечарамі, поўнымі рамантыкі. Звычайн... а яны збіраюць вялікую аўдыторыю і праходзяць ж... ыва, цікава, хвалююча. На адным з такіх вечароў сус... рэліся прадстаўнікі трох пакаленняў: ветэраны рэвалюц... ыі і грамадзянскай вайны, ветэраны першых калгасаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і моладзь, якая сёння працуе ў саўгасе.

Успам... ны землякоў — былога матроса крэйсера «Аўрора» І. Горскага, удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі Ф. Зайцава і Р. Камецкі, выступленні маладых рабочых саўгаса ўсхвалявалі залу.

Вечар закончыўся вялікім канцэртам. Самадзейныя артысты саўгаса выконвалі песні часоў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У другім аддзяленні салісты спявалі папулярныя песні аб Вялікай Айчыннай вайне і сучасныя песні.

Н. ІВАНОЎ.

У КЛУБЕ І Ў ПОЛІ

Агітбрыгада Асіповіцкага раённага дома культуры невялікая, але рэпертуар яе даволі багаты: песні і прыпеўкі, танцы, мастацкае чытанне. Удзельнікі гэтага калектыву — частыя госці калгасных і саўгасных клубаў. А вясной і ўлетку сцэну ім замяняе поле.

Вось і гэтымі днямі за вёскай Лука, дзе калгасніцы палолі буракі, спынілася машына-аўтаклуб. Самадзейныя артысты далі тут для працаўнікоў калгаса імя Ульянава канцэрт. Мая Толак спявала песні, а Галіна Прудніцава прачытала некалькі баек Ул. Корбана. Пад баян, на якім па-майстэрску іграе Міхаіл Філатаў, выступіла танцавальная група.

На перыяд уборкі ўраджаю агітбрыгада падрыхтавала новую праграму.

Праўленне клуба калгаса на чале з Верай Гаўрылаўнай Сідарэнка арганізавала перапіску з многімі ветэранамі вайны, якія жывуць у розных краінах, з Цэнтральным архівам Міністэрства СССР, каб выявіць герояў-вейнянцаў, якія

АНІЗАТАМЫ

У ВОІНАЎ БВА

«ПРЫВІТАННЕ МАСКВЫ»

Так называецца канцэрт-спектакль, які прывезлі з сабой маскоўскія студэнты. Кіруе канцэртнай брыгадай студэнт-дыпломнік Вышэйшага тэатральнага вучылішча імя Шчэпкіна пры Малым тэатры Юрый Масцюгін.

Студэнты пабывалі ў воінаў-гвардзейцаў Н-скай часці. З вялікай цікавасцю глядзелі танкісты ўрывак са спектакля Усеволада Вішнеўскага «Аптымістычная трагедыя» ў выкананні студэнтаў-дыпломнікаў Тэатральнага вучылішча імя Шчэпкіна.

Гарачымі апладысментамі ўзнагародзілі гледачы выпускніцу Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. І. Чайкоўскага салістку Серафіму Страноўскую, якая выканала арыі і песні пад акампанемент свайго аднакурсніка з фартэпіяннага аддзялення Барыса Міронава.

Вялікае ўражанне на воінаў зрабіла паэтычная кампазіцыя на тэмы твораў, прысвечаных Вялікаму Кастрычніку, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнам.

Сваім поспехам калектыў нямала абавязаны і таленавітым танцорам. Гэта студэнты школы-студыі пры Дзяржаўным ансамблі танца СССР Юрый Прохараў і Іна Смірнова. Тэмпераментна, з запалам выканалі яны «Рускую польку» і «Малдаўскі танец».

Канцэрт-спектакль «Прывітанне Масквы» паставіў старшы выкладчык школы-ву Малога тэатра заслужаны артыст Кабардзіна-Балкарскай АССР Д. Казноў. Музычныя кіраўнікі — старшы выкладчык інстытута імя Гнесіных народны артыст Казахскай ССР Е. Іваноў і прафесар Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя Чайкоўскага Л. Ройзман.

Маладзёжны ансамбль «Прывітанне Масквы» прабудзе ў Беларускай ваеннай акрузе месяц. За гэты час будучыя артысты і музыканты дадуць для воінаў і мясцовага насельніцтва каля 40 шэфскіх канцэртаў.

ГАСТРОЛІ НАРОДНАГА ТЭАТРА

Вось ужо траці год запар самадзейныя артысты народнага тэатра Мінскага трактарнага завода праводзяць свой адпачынак у творчых паездках па часцях і падраздзяленнях Беларускай ваеннай акругі. І сёлета тэатр выехаў да воінаў з новай сваёй работай — спектаклем «Юнацтва бацькоў» па п'есе Б. Гарбатава. За месяц самадзейныя артысты пакажуць 28 спектакляў. Гастролі будуць праходзіць у асноўным у аддаленых гарнізонах, часцях, у летніх лагерах.

Артысты народнага тэатра падрыхтавалі таксама вялікую і разнастайную канцэртную праграму, у якую ўключаны ўрыўкі з п'ес, арыі з опер, вершы і песні савецкіх і зарубежных аўтараў.

ГОСЦІ—ФРАНКОЎЦЫ

Народны артыст СССР Уладзімір Міхайлавіч Дальскі добра вядомы як выдатны драматычны акцёр, які стварыў на сцэне Кіеўскага акадэмічнага ўкраінскага драматычнага тэатра імя Івана Франка цэлую галерэю цудоўных вобразаў. Артыст з поспехам здымаецца і ў кіно. Ён іграе ў фільмах «Кроў людская — не вадзіца», «У мёртвай пятлі», «Гадзюка» і іншых. Цяпер Ул. Дальскі здымаецца ў кінафільме «Туман», які ствараецца на студыі «Малдовафільм».

Пра ўсё гэта расказаў воінам Н-скай часці артыст Кіеўскага тэатра імя Івана Франка Я. Казлоў. Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне Ул. Дальскага. Ён прачытаў байкі і гумарыстычныя апавяданні.

Воіны прагледзелі таксама фрагменты з кінафільмаў, у якіх удзельнічае вядомы артыст.

СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМІ

Бібліятэчныя работнікі Мінскага гарнізона сустрэліся ў акруговым Доме афіцэраў з групай беларускіх пісьменнікаў.

Аб ваенна-патрыятычнай тэме ў творах беларускіх пісьменнікаў расказаў кіраўнік секцыі ваенна-мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР М. Аляксеў.

Аўтар рамана «Нямігі крывавыя берагі» Ул. Карпаў расказаў пра страшныя гады фашысцкай акупацыі Мінска, пра мужную барацьбу мінскіх падпольшчыкаў.

Стадыёна запасу пісьменнік Мікалай Круглавых гаварыў аб ролі армейскіх літаратурных аб'яднанняў у выхаванні будучых літаратараў.

ШЭФЫ ПАГРАНІЧНІКАЎ

— Шэфы прыехалі! — радасна ўсклікнуў пагранічнік, убачыўшы запылены аўтобус, які пад'язджаў да заставы.

— Малайцы, не забываюць... Відаць, зноў з канцэртам, — дадаў другі воін.

Салдат не памыліўся. Сапраўды, гэта былі даўнія сябры пагранічнікаў — кампазітары і артысты са сталіцы Беларусі на чале са старшынёй Саюза кампазітараў БССР, заслужаным дзеячом мастацтва рэспублікі Д. Камінскім. Яны прыехалі на самую далёкую заставу.

Даведаўшыся, што на заставе адбудзецца вялікі канцэрт, рашылі паслухаць яго і лесніку, і жыхары бліжэйшай вёскі. Канцэрт быў змястоўны. Спачатку выступіў кампазітар Д. Камінскі. Ён расказаў пра культурна-шэфскую работу кампазітараў і музыказнаўцаў Беларусі на граніцы, іх паездку ў гарады Сібіры і Узбекістана.

Пра сваю творчасць гаварыў малады кампазітар Дзмітрый Смольскі, а заслужаная артыстка БССР Тамара Пастуніна выканала яго песні.

З вялікім поспехам выступілі ў канцэрце народныя артысты БССР Лідзія Галушкіна, Яўген Палосін, заслужаная артыстка БССР Елізавета Весніна, лаўрэат VI Сусветнага фестывалю моладзі цымбаліст Веніямін Бурковіч і іншыя.

Кампазітары і артысты далі канцэрты і на суседніх заставах.

Яшчэ шырэй пачалі развівацца сувязі дзеячоў навукі, літаратуры і мастацтва Беларусі з пагранічнікамі пасля XXIII з'езда КПСС. Асабліва атрымала развіццё агітацыйна - прапагандысцкая работа, у яную актыўна ўключыліся вучо-



Ім... ёсць пра што пагаварыць, ёсць што расказаць. На здымку: народны артыст БССР Я. Палосін (справа) і музыкант В. Бурковіч гутараць з пагранічнікамі заставы.

Фота АЎТАРА.

...ныя Акадэміі навук БССР і на вуковыя супрацоўні... ні р... каду інстытутаў Мін... ска... За вялікую работу па культурнаму шэфству над... пагранічнікамі Бела... рускаму рэспубліканскаму камітэту прафсаюза работнікаў культуры быў прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг Камітэта дзяржаўнай бяспекі Саюза ССР.

М. БАРАЎКОЎ, маёр.

ТРЫ МАСТАКІ — ТРЫ ВЫРАШЭННІ

Гурый БАРЫШАЎ.

МАСТАЦКАЕ вырашэнне спектакля заўсёды цесна звязана з аўтарскім стылем і рэжысёрскай задумай. З аднаго боку, яно заклікана захаваць непаўторнасць вобразнага бачання драматурга, з другога — усяляк садзейнічаць выяўленню рэжысёрскай трактоўкі п'есы.

Па сутнасці мастак і рэжысёр — сааўтары. Але пасля таго, як у вонкавым аблічы спектакля галоўнае вырашана, функцыі рэжысёра і мастака рэзка падзяляюцца. Як мастак можа прыглушыць рэжысёрскія знаходкі няўдалым афармленнем, так і рэжысёр, вырашаючы канкрэтныя эпізоды спектакля, можа, у сваю чаргу, недастаткова ўмела выкарыстаць планіровачныя і вобразныя пошукі мастака. Гаворачы пра афармленне спектакля, яго агульную мастацкую задуму, мы звычайна маем на ўвазе сааўтарства мастака і рэжысёра, а гаворачы пра вырашэнне спецыфічна выяўленчае, большай часткай чыста тэхналагічнае, апеліруем у першую чаргу да мастака.

У трох тэатрах рэспублікі—імя Якуба Коласа ў Віцебску, Магілёўскім абласным і Брэсцкім імя Ленінскага камсамола Беларусі—пастаўлены спектакль па раману І. Шамякіна «Сэрца на далоні».

Аўтар гэтых нататак не ставіць перад сабой задачы даць агульную ацэнку спектаклям. Аб іх дастаткова пісалі ў друку. Нам хацелася б толькі прасачыць, які адбітак на стылістыку пастановак паклала ва ўсіх трох тэатрах мастацкае афармленне, як падышлі да вырашэння сваіх задач мастакі.

Дэкарацыі «Сэрца на далоні» ў Тэатры імя Якуба Коласа найбольш манументальныя па сваім характары. Яны хоць і выглядаюць крыху абстрагавана, але досыць дакладна характарызуюць месца дзеяння. Заслужаны дзеяч мастацтва БССР Я. Нікалаеў змясціў у цэнтры сцэнічнага круга ўзвышэнне, па якім ідзе дарога. Разнастайныя камбінацыі дынамічных пляцовак, спускных гафрыраваных палотнаў (яны адначасова служаць і экранамі для каляровых праекцый) ствараюць надзвычай багатыя магчымасці для мізансцэн і хуткіх змен карцін. А іх у віцебскім варыянце інсцэніроўкі вельмі многа. Уся дэкарацыйная ўстаноўка, кулісы, спускныя палотны-экраны — белыя па колеру. На іх фоне празрыста і лёгка глядзяцца светла-блакітныя праекцыі: цені дрэў, сцены дамоў і г. д. Але вось знікаюць праекцыі, і белыя манументальныя сцены, гафраваныя кулісы перафарбоўваюцца ў безаблічны фон. З посткам можна іграць на іх і «Лізістрату», і «Антыгону». Дэкарацыі «нейтральныя» да персанажаў, да таго, што адбываецца на сцэне. Не дакана прадумаў мастак падбор малі, афармленне рада карцін (кабінет сакратара гаркома, вёска). Наўсцяны ў каларыстычных адносінах і нал, калі ідзе буйны... аранжавы снег.

У цэлым аднак пра работу Я. Нікалаева можна гаварыць як пра досыць цікавую. Мастак своеасабліва «прачытаў» п'есу. Больш сур'ёзныя заўвагі мы вымушаны выказаць у адрас магілёўскага спектакля. Афармленне тут (мастак М. Волахаў) аказалася надзвычай эклектычным. На сцэне можна ўбачыць усё: двухпавярховую канструкцыю для рэтраспектывы, дзе за бязевай заслонай узнікае люмінісцэнтны жывапіс дзвярэй і сцен, і побач—аб'ёмная мэбля. Жывыя персанажы дзейнічаюць побач з маляванымі (сцэна ў аперацыйнай). На задніку пры ўпамінанні аб героях нечакана з'яўляюцца іх... зялёныя (!) фотапартрэты. Сцэну з двух бакоў акаймоўваюць асіметрычныя шэрыя ці брудна-чорныя кулісы, а з-за іх па ходу дзеяння з грукатам выязджаюць фуркі з мэбляй і... акцёрамі. Усё гэта адбываецца на вачах у гледачоў, пры поўным асвятленні. «Слугі прасцэніума» — рабочыя ў камбінезонах у час самога дзеяння мяняюць мэблю. Ствараецца ўражанне, што пастаноўшчыкі паставілі сабе за мэту гранічна агаліць тэатральныя прыёмы і дзеля гэтага змяшалі ў адну кучу ўсе вядомыя «знаходкі», не зрабіўшы нават спробы крытычна асэнсаваць іх.

Грубыя памылкі дапусціў мастак пры афармленні асобных карцін. Кабінет Тарасава, напрыклад, уражвае сваёй безгустоўнасцю, у такім выглядзе ён прафанірыўе героя як партыйнага работніка. Аднак самае няўдалае ў спектаклі — касцюмы. Відаць, афарміцель не толькі не ўяўляе сабе, чым адрозніваецца касцюм тэатральны ад бытавога, але і не разумее агульных патрабаванняў да адзення на сцэне. Большасць герояў апрануты ў касцюмы шаравата гамы і літаральна зліваюцца з шэрымі бязевымі палотнамі.

Адзенне персанажаў — рознастылявое, і тут нельга вінаваціць ва ўсім мастака. Пэўную віну нясе і дырэкцыя. У некаторых тэатрах укаранілася практыка «камбінаванага падбору» мэблі і касцюмаў, прычым камбінаваны падбор звычайна намагаюцца апраўдаць эканоміяй сродкаў. Але эканомія тут уяўная, яна наносіць непапраўную шкоду мастацтву, ідэям, якія закладзены ў спектаклях. Неахайна або безгустоўна апрануты герой выклікае зняважлівыя адносіны да сябе гледача. Такога героя не ўспрымеш як ідэал, яго прыклад не захочацца пераймаць.

Законы сцэны маюць вялікую сілу. Правільнае выкарыстанне іх робіць гледача саўдзельнікам спектакля, прымушае яго актыўна «ўключыцца» ў дзеянне, перажываць разам з героямі. Пакідаючы тэатр, глядач поўны роздуму аб убачаным. А вось калі тэатр перабольшвае, ён часта дасягае адваротнага. «Усё ўбачанае — не жыццё, не жыццёвая праўда, гэта толькі «тэатр», — нібы падкрэслівае ён. Якраз такі адваротны эфект, выкліканы няўменнем карыстацца тэатральнай умоўнасцю, і атрымліваецца ў Магілёве.

У творчай гісторыі Брэсцкага тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі пастаноўка «Сэрца на далоні», бясспрэчна, зойме значнае месца. Гэта разумны і сур'ёзны спектакль, які вызначаецца выдатным акцёрскім ансамблем, дакладнай рэжысёрскай задумай. Шмат працы ўклаў у афармленне мастак тэатра А. Марозаў. Яго афармленне ўмоўна можна было б назваць светлавым. Галоўнае ў ім — каляровыя праекцыі. Мастак паставіў на сцэне тры экраны—цэнтральны і два бакавыя, і з іх дапамогай вырашае ўсе асноўныя задачы.

Прыём праекцыйнай экспазіцыі не новы і не раз выкарыстоўваўся ў тэатры. Уся справа ў тым, *што* праектуецца на экраны. У Брэсцкім тэатры здолелі ўмоўную праекцыю арганічна знітаваць з тым, што адбываецца на сцэне. Афарміцель шмат увагі аддаў абстаноўцы, у якой адбываюцца падзеі, стварэнню канкрэтных мастацкіх «рэалій».

Было б сапраўды дзіўна, калі б у спектаклі, створаным на матэрыяле сучаснасці, ігнаравалася нацыянальнае, бытавое і геаграфічнае асяроддзе. Вядома, не варта ўзводзіць на сцэне этнаграфічныя павільёны і ставіць «натуральныя» дрэвы. Сучасны тэатр адмаўляецца ад такой аляпаватай бутафорыі. Але нельга не лічыцца і з бытавым жанрам твора. Уся справа ў дакладнасці адбору, ва ўменні знайсці дэталі афармлення і прымусіць яе «працаваць» на спектакль. У А. Марозава гэта атрымліваецца.

Вось запушчаная бальніца, у якой ляжала Зося, і — поўная святла і паветра клініка Яраша. Вось кабінеты: Тарасава і Гукана. Два інтэр'еры, а за імі дзве характарыстыкі. У мэбліроўцы, касцюмах, нават у тым, якія акуляры носяць персанажы, адчуваецца вельмі старанны адбор.

Запамінаецца агульны каларыт спектакля — пастэльны, мяккі. Пераважаюць шаравата-блакітныя і бежавыя адценні. Экспазіцыі інтэр'ераў вельмі графічныя. На жаль, рэзкія, анілінава-насычаныя фарбы ў такіх карцінах, як «Рыбалка», «Дача», «Калгас», уносяць у высакародны лад афармлення некаторую стракатасць. Няўдалая, нам здаецца, дэкарацыя гарышча. Такія гарышчы былі ў модзе ў рамантычных спектаклях першай паловы XIX стагоддзя. Але ў цэлым афармленне нельга не прызнаць цікавым, яно вобразнае па выяўленчай мове, выразнае, асобныя ж недахопы няцяжка выправіць.

...Тры спектаклі ў трох тэатрах, тры розныя рашэнні мастакоў. Ужо адно супастаўленне гэтых работ дае падставы для роздуму.

ДОМ КУЛЬТУРЫ Ў АСАДЗЕ

У адзін з веснавых дзён гэтага года жыхары невялікага гарадка на Віцебшчыне — Дзісны сталі сведкамі незвычайных манеўраў мясцовай пажарнай дружыны. Не, на гэты раз не было ні шлангаў, ні пажарных лесвіц, ніхто не крычаў, не мітусіўся, не лез у агонь. Бо і агню не было відаць, колькі ні ўглядаліся дзіснянцы ў вокны Дома культуры, усе хады і выхады якога блакіравалі пажарнікі.

Але, нарэшце, дзверы расчыніліся, і натоўп паваліў з памяшкання. Служыцелі багра і шланга заварушыліся. Вось з клуба павольна выйшаў пажылы мужчына з крэслам у руках. Імгненне, і крэсла вырваў у яго адзін з пажарнікаў і кінуў убок. Такі ж лёс напаткаў і кухонную табурэтку, якую несла сярэдніх год грамадзянка. Адным словам, праз якія дзесяць мінут ля Дома культуры ляжала некалькі дзесяткаў крэслаў, табурэтак, лавак, і г. д. І тады брандмайстар, твар якога выражаў пачуццё выкананага службовага абавязку, уважліва пералічыў канфіскаваны інвентар, аб чым тут жа быў складзены акт. Пасля гэтага начальнік дзісненскіх пажарнікаў падаўся ў Дом культуры і ўрачыста ўручыў акт дырэктару клуба Вандзе Дзмітрыеўне Ерамянок. Тая ўздыхнула і паклала акт у папку, дзе ўжо сабралася нямала такіх дакументаў.

Але не будзем больш інтрыгаваць чытача, растлумачым, чаму дзісненскія пажарнікі ў той вечар узялі на сябе функцыі не зусім уласцівыя іх мужнай прафесіі.

Пачалося ўсё з таго, што ў Доме культуры быў аб'яўлены канцэрт. Адразу перад касай вырасла чарга. Праз якую гадзіну кіраўнікі Дома аб'явілі: «Усе білеты прададзены». Дзісненцаў, якія засталіся без білетаў, было куды больш, чым з білетамі. Яны патрабавалі дырэктара Дома культуры. А тая ў гэты час сядзела ў касе, яшчэ і яшчэ раз падлічваючы колькасць прададзеных білетаў. Лічба сыходзілася на ста сямідесяці. Гэта была мяжа, устаноўленая пажарнікамі ў сувязі з аварыйным станам запаснога выхаду.

Што ж рабіць? З аднаго боку, строгая забарона пажарнікаў, з другога — за сценкай бушуе натоўп аматараў трапіць на канцэрт.

— Э, хай што будзе,— сказала Ванда Дзмітрыеўна і рашыла прадаць яшчэ сорак білетаў — г. зн. на поўную колькасць месц у глядзельнай зале.

Але цяпер паўстала задача: як размясціць усіх? Ва ўсім Доме культуры аказалася не больш ста крэслаў, уключаючы тры з кабінета дырэктара. Але выйсце і тут было знойдзена. Тыя, каму не хапіла месц, прыйшлі са сваімі крэсламі і табурэткамі.

Каб ведала Ванда Дзмітрыеўна, як падвядуць яе гэтыя «левыя» крэслы і табурэткі! Гэта ж з-за іх пажарнікі і даведаліся, колькі людзей папала ў залу звыш устаноўленай імі нормы...

Вось так Вандзе Дзмітрыеўне было ўручана яшчэ адно персанальнае папярэджанне. Яно лягло там побач з дакументамі амаль двухгадовай перапіскі з абласным упраўленнем культуры аб рамонце Дзісненскага клуба. Дырэктар нават каштарыс сама склала — на самыя неабходныя, аварыйныя работы. Падлічыла ўсё да капеечкі.

Але абласныя таварышы рашылі так — калі просяць пяць тысяч, дык трэба даць палавіну. І вось два гады ідзе дыялог:

Дзісна:— Мала.
Віцебск:— Хопіць.
Дзісна:— Мала.
Віцебск:— Хопіць.

А Дом культуры з кожным месяцам, як кажуць, здае. Дах зусім прагніў, і ў дождж у памяшканні хоць парасон раскрывай. Паднімаешся па лесвіцы на другі паверх, дык яна ходзіць пад табой, як жывая. Даўно паабвалвалася лепка, што была на карнізах.

Ну, а пра мэблю і гаварыць няма чаго. У Доме культуры сёння баяцца дэманстраваць вясёлыя кінафільмы. Яшчэ, барані божа, чалавек падскочыць ад рогату і здарыцца няшчасце — крэслы ўжо каторы раз рамантавалі, з іх тырчаць такія цвікі, што...

Расказалі мы ўсю гэтую гісторыю і задумаліся. А хто ж вінаваты ва ўсім гэтым? Здаецца, і вінаватых няма — усе сумленна выконваюць свае абавязкі, так сказаць, не адыходзячы ад літары цыркуляра. Пажарнікі клапоцяцца аб проціпажарнай бяспецы. Таварышаў з абласнога цэнтра таксама ні ў чым не папракнеш — яны берагуць дзяржаўную капейку. А Дом культуры пры ўсіх гэтых клопатах дыхае на ладан. І выйсця з гэтага становішча не відаць, бо кола замкнулася. Хто ж яго разарве?

Б. СІНЕЛЬНІКАЎ.

СУСТРЭЧА С ПЕСНЯЙ

У Маладзечна выступіў аб'яднаны хор Беларускага радыё і тэлебачання і Белдзяржкансерваторыі пад кіраўніцтвам дацэнта В. Роўды.

Больш за тры гадзіны гучалі са сцэны творы савецкіх кампазітараў, рускай і зарубежнай класікі, апрацоўкі народных песень.

Яснасць дыкцыі, інтанацыі і метрарытму, разнастайнасць гукавых фарбаў, ансамблевасць гучання дазваляюць гаварыць пра хор як пра адзін з лепшых прафесіянальных калектываў рэспублікі. Слухачы цёпла прынялі песні «Слухайце, людзі», «Бура народная», «Балада пра салдацкае сэрца», фінал «Патэтычнай араторыі» Свірыдава. Рад твораў паўтараўся на «бис». Акрамя дацэнта В. Роўды хорам дырыжыравалі выпускнікі кансерваторыі Н. Жураўленка, А. Смагін, Э. Буравіна, І. Музурава.

У канцэрце прыняў удзел і жаночы хор дырыжорска-харавога аддзялення Маладзечанскага музычнага вучылішча (кіраўнік А. Шунтаў).

У заключэнне на сцэну выйшлі ўсе тры калектывы — хор радыё і тэлебачання, кансерваторыі і музычнага вучылішча.

І яшчэ адно цікавае выступленне на гэтым канцэрце хочацца адзначыць. Рэктар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Алоўнікаў расказаў пра фестываль беларускага мастацтва ў Расіі. Студэнты кансерваторыі Л. Кудзеля і В. Пакідчанка выканалі песні Ул. Алоўнікава, якія гучалі ў гарадах і сёлах Сібіры і Урала ў час фестывалю, — «Лясную песню», «Песню пра Мінск», «Песню аб Брэсцкай крэпасці».

Л. ШКОЛЬНІКАЎ,
дырэктар Маладзечанскага
музычнага вучылішча.

ВЯЛІКІ БАЛЕТ ТРАКТАРНАГА

АНСАМБЛЬ народнага танца «Лявоніха» — адзін з лепшых самадзейных калектываў рэспублікі. Ды і не толькі самадзейных. Па ўзроўню майстэрства, па выканаўчай культуры, па выразнасці і чысціні танца калектыў трактаразаводцаў мала чым уступае прафесіяналам.

Канцэрты «Лявоніхі» заўсёды прыцягваюць гледачоў. Ансамбль выступаў у Маскве, Рызе, Вільнюсе, Волгаградзе. І ўсюды яму спадарожнічаў поспех.

А зусім нядаўна было інакш.

...Не шанцавала з харэаграфічным гуртком Дома культуры Мінскага трактарнага. Рэпетыцыі праходзілі нерэгулярна, часта мяняліся кіраўнікі. На ўвесь велізарны завод было толькі дванаццаць энтузіястаў народнага танца. З імі і пачаў работу новы кіраўнік калектыву заслужаны дзеяч культуры БССР Мікалай Чысцякоў.

Стварыць калектыў часам лягчэй, чым аднаўляць стары. Трэба было выправіць памылкі папярэднікаў, нанава зацікавіць моладзь, прымусіць яе паверыць у свае сілы. І, галоўнае, пераканаць, што кіраўнік у калектыве не часовы, а прыйшоў надоўга, назаўсёды.

Любві да працы Чысцякову не пазычаць. Яшчэ зусім нядаўна ён працаваў у Ансамблі песні і танца ваеннай акругі і адначасова вучыўся ў харэаграфічным вучылішчы. Як бы позна ні заканчвалася выступленне, раніцаю Чысцякоў абавязкова быў у класе. А цяпер жа самому трэба было вучыць іншых.

Чысцякоў пачаў з цяжкай падрыхтоўчай работы. Былі ўведзены як абавязковыя ўрокі класічнага і характарнага трэнажу. Шмат гадзін ішло на апрацоўку асобных рухаў, танцавальных камбінацый. Чысцякоў звяртаў увагу нават на хаду танцораў. Патрабаваў строга, нікому не даваў скідкі, не дараваў памылак.

Спачатку не ўсе былі задаволены ўрокамі. Дарэмна, маўляў, трацім час, —гаварыў сёй-той,— трэба рыхтаваць праграму, ставіць новыя танцы, а не займацца практыкаваннямі, ад якіх немаведама налі яшчэ будуць выніні. Нездаволеныя пакінулі гуртон. Але ядро будучага калектыву засталося.

А кіраўнік па-ранейшаму не пакідаў без увагі ніводнай дробязі. Яго цікавілі і склад удзельнікаў, і прымерка канцэртных касцюмаў, і падрыхтоўка сцэны. Часам рэпетыцыі зацягваліся да позняга вечара. Заканчваліся кінасеансы, гаслі агні ў вокнах клуба, а ў фае, дзе займаліся гурткоўцы, па-ранейшаму гучаў строгі, метадычны голас Чысцякова. У харэаграфіі слова не галоўнае. Чысцякоў выходзіў на сярэдзіну і раз, другі, трэці, дзесяты цярпліва паказваў кожны рух, кожны элемент яго.

У калектыве не толькі вывучалі танцы, але і выхоўвалі моладзь. Вучылі працавітасці, дысцыпліне, любві да мастацтва. Кіраўнік пастаянна цікавіўся, як ідзе вучоба танцораў, як у іх справы на рабоце, дома.

Была падрыхтавана і паказана першая праграма, адбылося даволі шмат канцэртаў, але ансамбль пакуль яшчэ нічым не вызначаўся. Трэба было думаць пра фарміраванне творчага аблічча калектыву. І тут не апошнюю ролю адыгралі рэгулярныя заняткі класічнай харэаграфіяй. Паступова з'явіліся ў танцораў і дакладнасць у рухах, і выразнасць пластыкі, і пачуццё стылю. Кіраўнік дамагаўся ўсё большай і большай чысціні выканання. Ён вучыў танцораў ствараць характары, шукаў разам з імі вобразнае рашэнне нумароў.

М. Чысцякоў на рэпетыцыі.

Вось «фірменны» танец трактаразаводцаў — «Лявоніха». Здавалася б, што тут можна сказаць новага. А трактаразаводцы здолелі надаць сваёй «Лявоніхе» і асаблівы бляск і свой каларыт. Разам з першымі, такімі знаёмымі, тактамі, на сцэну ўрываецца святочнасць, узнёслы настрой. Танец захапляе масавасцю, юнацкім запалам, віхурным тэмпам, ён нібы задае тон усяму канцэрту...

Танцы трактаразаводцаў расказваюць і пра мірную працу савецкіх людзей («Салігорскія шахцёры»), і пра дружбу народаў («За мір і дружбу»), і пра баявыя традыцыі («Герой Брэсцкай крэпасці»). У творчых планах калектыву разгорнутая харэаграфічная сюіта «Этапы вялікага шляху». Сродкамі танца яна павінна адлюстраваць важнейшыя падзеі гісторыі нашай Радзімы. Сваю работу калектыў хоча прысвяціць 50-годдзю Кастрычніка.

Па-ранейшаму ў калектыве патрабавальна шліфуюць кожны нумар. Не ляную́цца перарабляць, дапрацоўваць ужо зробленае. Харэаграфічная мова кампазіцый Чысцякова заўсёды лаканічная, часам нават скупаватая. Але затое заўсёды выразная! Балетмайстар падоўгу прадумвае і адбірае асобныя рухі, удакладняе агульны малюнак, дзесяткі разоў правярае нумар, перш чым вынесці яго на суд публікі.

Высокую ацэнку заслужыла адна з апошніх работ ансамбля — «Палавецкія танцы» Барадзіна ў пастаноўцы Міхаіла Фокіна. Гэта першы ў нашай рэспубліцы выпадак, калі самадзейны калектыў звяртаецца да класічнага рэпертуару. Ці здолеюць самадзейныя артысты справіцца з такой складанай задачай? Пытанне гэтае хвалявала многіх. Далёка ж не ў кожнай прафесіянальнай трупе «Палавецкія танцы» Фокіна знаходзяць і вартае сцэнічнае ўвасабленне, і добрых выканаўцаў. І вельмі прыемна было пераканацца, што ансамбль з пастаноўкай справіўся. Характэрна, што самадзейныя артысты не «падганялі», не «прыстасоўвалі» Фокіна «пад самадзейнасць», а захавалі ў недатыкальнасці ўсю яго цудоўную харэаграфію. Пры пастаноўцы «Палавецкіх танцаў» вялікую дапамогу ансамблю аказалі заслужаныя артысты РСФСР Н. Стукаліна і А. Андрэеў. Калектыву трэба і далей прыцягваць да пастановак прафесіянальных майстроў, гэта паможа яму яшчэ больш павысіць мастацкі ўзровень праграмы і значна пашырыць рэпертуар.

Цяпер у трактаразаводцаў ёсць усе неабходныя ўмовы — і вялікая, добра абсталяваная балетная зала новага Палаца культуры, і цудоўны рэквізіт, і, самае галоўнае, —вопытныя, добра падрыхтаваныя танцоры. Ансамбль (у ім цяпер каля 60 чалавек) надзейна «падпіраюць» танцавальная студыя, дзіцячыя харэаграфічныя гурткі. Калектыву пад сілу пастаноўка самых складаных балетных спектакляў, можна нават гаварыць пра стварэнне на заводзе і першага ў рэспубліцы народнага тэатра балета.

А. КАЛЯДЭНКА,
мастацкі кіраўнік
Беларускага
харэаграфічнага
вучылішча.

Многія тысячы кіламетраў... Чатыры месяцы гастроляў, руплівай пачэснай працы. Беларуская песня і музыка ў выкананні Дзяржаўнага народнага хору пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча гучала на вялікіх будоўлях Сібіры, ля сівых хрыбтоў Урала і ў сонечным Узбекістане. А потым зноў гастролі — па Украіне, родай Беларусі. І куды б ні прыязджалі артысты, усюды іх сустракалі з вялікай пашанай і гасціннасцю. Паглядзіце на здымак. Гэта нашы артысты прыехалі ў калас «Савецкая Беларусь» Высокаўскага раёна. «Хлеб-соль, дарагія госці», — ад шчырага сэрца сказалі ім калгаснікі. А потым на імправізаванай сцэне пачаўся канцэрт. Дружнымі апладысментамі сустракалі гледачы кожнае выступленне ўдзельнікаў хору. А потым запрацалі: «Прыязджайце часцей».

Цяпер удзельнікі творчага калектыву пасля доўгіх падарожжаў вярнуліся ў Мінск. Кароткі адпачынак — і зноў артыстаў пакліча дарога.

Фота артыста хору Г. ФРАЛОВА.

СОТЫ ВЫПУСК КАНСЕРВАТОРЫІ

Ленінградская кансерваторыя імя Мікалая Рымскага-Корсакава шырока вядомая ў Савецкім Саюзе і за рубяжом. Яна была заснавана вядомым рускім кампазітарам Антонам Рубінштэйнам. Шмат выдатных музыкантаў падарыла свету гэта навучальная ўстанова. Сярод яе выхаванцаў былі Пётр Чайкоўскі, Мікалай Мяскоўскі, Сяргей Пракоф'еў, Дзмітрый Шастаковіч, Яўгеній Мравінскі, Георгій Свірыдаў, выдатны савецкі піяніст Павел Серабракоў — цяпер рэктар кансерваторыі—і многія іншыя. Тут вучыліся таксама пасланцы многіх зарубежных краін. На трэцім Міжнародным конкурсе імя Чайкоўскага, які толькі што закончыўся, лаўрэатамі сталі выхаванцы кансерваторыі спевакі Уладзімір Атлантаў і Мікалай Ахотнікаў, скрыпачы Масуна Усіода і Зіновій Вінікаў, віяланчэлістка Элеанора Тэстэлец і вучні сярэдняй спецыяльнай школы пры кансерваторыі піяніст Рыгор Сакалоў (самы малодшы ўдзельнік конкурсу) і віяланчэліст Міхаіл Майскі.

У гэтым годзе кансерваторыю скончыла 188 чалавек. 19 з іх атрымалі дыплом выдатніка. Маладыя спевакі, дырыжоры, піяністы, інструменталісты будуць працаваць у 35 гарадах шасці рэспублік Савецкага Саюза. Выпуск сёлетняга года асаблівы—юбілейны: першая ў краіне кансерваторыя выпускае сваіх выхаванцаў соты раз. У кансерваторыі адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны гэтай падзеі.

АДН.

ШТО пішуць ПРА НАС

ТЭАТР ЗМАГАЕЦЦА ЗА П'ЕСУ

У той час, як мінчане гасцінна прымаюць у сябе пасланцоў братняй тэатральнай культуры — акцёраў Кіеўскага дзяржаўнага акадэмічнага ўкраінскага драматычнага тэатра імя Івана Франка, у Кіеве, на сцэне тэатра імя Лесі Украінкі, з поспехам праходзяць гастролі Беларускага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Украінскі друк шырока асвятляе гэту падзею ў культурным жыцці рэспублікі.

Прапануем увазе чытачоў артыкул з газеты «Культура і життя», прысвечаны аналізу першых паказаных кіяўлянам спектакляў — «Людзі на балоце» і «Выклік багам».

Багата горкіх слоў ужо сказана пра адставанне драматургіі ад запатрабаванняў часу. Але, відаць, найбольш плённая пазіцыя тых тэатральных калектываў, якія не абмяжоўваюцца сцэнаграмі і заклікамі, а, «закасаўшы рукавы», працуюць над стварэннем драматургіі.

Два першыя паказаныя на гастролях у Кіеве спектаклі Беларускага тэатра імя Янкі Купалы сведчаць пра яго творчую актыўнасць у рэпертуарным пошуках. Інсцэніроўка вядомага рамана Івана Мележа «Людзі на балоце» ўзнікла ў самім тэатры. І аўтары сцэнічнай кампазіцыі Т. Абакумоўская і З. Браварская, і рэжысёр-пастаноўшчык Б. Эрын праявілі вартую пераймання ініцыятыву, намагаючыся перанесці на сцэну выдатны твор сучаснага беларускага пісьменніка. Гутарка ідзе, уласна кажучы, пра два творы, бо ў інсцэніроўцы выкарыстаны матэрыял і з другога рамана Мележа «Подых навальніцы», які з'яўляецца працягам «Палескай хронікі».

На вялікі жаль, аўтар раманаў, які паспяхова працуе і ў галіне драматургіі, не выступіў як аўтар п'есы, паказанай тэатрам. Гэта не магло не адбіцца на яе якасці. Сцэнічная кампазіцыя, зробленая Т. Абакумоўскай і З. Браварскай, па сутнасці не ўзнімаецца вышэй узроўню ілюстрацыйнага «прыстасавання» рамана да сцэны. Аўтарам кампазіцыі не хапіла той творчай смеласці, якую мог бы, без сумнення, выявіць І. Мележ і якая прывяла б да стварэння самастойнага драматычнага варыянту.

Сцэны з дзвюх кніг пазбаўлены дастатковай арганічнай еднасці. Па сутнасці, паслядоўна на сцэне паказана толькі асабістая гісторыя ўзаемаадносін Васіля і Ганны. Няхай гэтая гісторыя досыць значная і выразная, але карціна сельскага жыцця бурных дваццатых гадоў, намаляваная Мележам, зведзена ў інсцэніроўцы да ўзроўню «антуражу», інакш кажучы, эскізнай акантоўкі.

Шматлікія падзеі на сцэне, што пачынаюцца ў некаторых эпізодах, заміраюць у самым зародку. Твор Абакумоўскай і Браварскай можна смела назваць «п'есай завязак». Гэтыя шматлікія завязкі не толькі не даходзяць да свайго лагічнага завяршэння, а і наогул часам механічна змяняюць адна адну. Напрыклад, ідэя Яўхіма «ўваскрасіць» на страх вёсцы постаць бандыта Маслака, якая ўспрымаецца як важны сюжэтны вузел, нават не ўпамінаецца ў далейшым ходзе дзеяння. А фігура ўпаўнаважанага валвыканкома Зубрыча пасля злавеснай экспазіцыі не з'яўляецца больш ні разу на сцэне.

Тэатр прыклаў усе намаганні, каб сваімі сцэнічнымі сродкамі папоўніць літаратурныя страты. Найбольшым дасягненнем спектакля з'яўляецца яго бясспрэчная народнасць. Іграючы ілюстрацыйныя, не заўсёды аб'яднаныя фрагменты з раманаў, тэатр усё ж дасягнуў сваім мастацтвам агульнай верагоднасці ў адлюстраванні эпохі і асяроддзя. Хоць некаторыя вобразы намаляваны на сцэне занадта паспешліва і павярхоўна, але ў цэлым зборны вобраз народа, які выходзіць на шлях гістарычных перамен, створаны даволі ўдала. Вобраз гэты часам не досыць індывідуалізаваны, але пераканальны ў сваім супольным грамадскім парыве. Высокае майстэрства ансамбля, якім заўсёды славіўся Тэатр імя Янкі Купалы, не здрадзіла яму і ў гэтым, досыць нялёгкім сцэнічным выпрабаванні.

Творчасць выдатных майстроў беларускай сцэны П. Малчанава, В. Пола, Р. Кашэльнікавай, З. Стомы абмежавана інсцэніроўкаю, але разам з іншымі сваімі таварышамі і моладдзю тэатра яны ўсё ж ствараюць тое маляўнічае жыццё сцэны, якое пакрывае многа штучных «стыкаў» літаратурнага касцяка. Па сутнасці толькі артысты Б. Уладамірскі (Яўхім), Г. Гарбук (Васіль) і Л. Давідовіч (Ганна) атрымалі з рук аўтараў інсцэніроўкі вобразы з паслядоўнай сцэнічнай біяграфіяй. Што датычыць Б. Уладамірскага, дык ён яшчэ раз пацвердзіў добрую думку, якая склалася пра яго ў нашым горадзе з папярэдніх гастроляў. А новыя імёны Г. Гарбука і Л. Давідовіч сведчаць, што Тэатр імя Янкі Купалы паспяхова вырошчвае сваё папаўненне. Асабліва датычыць гэта работы Г. Гарбука. Створаны ім вобраз Васіля з'яўляецца, бясспрэчна, найвышэйшым дасягненнем спектакля. Можна толькі сабе ўявіць, якога поспеху дасягнуў бы таленавіты калектыў тэатра, калі б сустрэўся ў сваёй рабоце з драматургіяй на літаратурным узроўні раманаў І. Мележа.

Непрафесіянальны драматург, урач-псіхіятр А. Дзялендзік напісаў другую, паказаную тэатрам п'есу «Выклік багам». Яна таксама не пазбаўлена даволі істотных хібаў. Таму і не дужа верыш у гісторыю перамогі над смяротнаю хваробай пры дапамозе адных толькі «маральных фактараў» і ўспрымаеш п'есу Дзялендзіка не як расказ пра рэальныя факты, а як палымяны лірычны заклік да барацьбы з непераадольным —да маральнай нескаронасці, да актыўнасці валявой мары.

Тэатр імя Янкі Купалы правільна адчуў у п'есе яе плённае зерне, загарэўся запалам аўтара, прасякнуўся напружаннем яго волі. Пастаноўку Б. Эрына вызначае паслядоўная рамантызацыя, якая ахоплівае ўсе сцэнічныя вобразы, усе кампаненты спектакля. Рэжысёр смела звяртаецца да вобразнага сцэнічнага абагульнення. Нават метафару, увасобленую ў назву п'есы, ён расшыфроўвае канкрэтнай мізансцэнай. Тэатр цалкам унікануў небяспеці меладраматызму, якую больш чым у дастатковай меры тоіць у сабе драматургічны матэрыял. Бо пры няправільным сцэнічным прачытанні сюжэтная ўмоўнасць п'есы можа лёгка абярнуцца фальшам, эмацыянальная ўзнёсласць—ператварыцца ў штучны пафас, а рамантычныя парасткі—расквітнець меладрамаю з яе прымітыўным валюнтарызмам. Бо менавіта ў меладраме дзеючыя асобы зусім лёгка паміраюць і ўваскрасаюць па волі аўтара, які не абмяжоўвае сваю фантазію праўдападобнасцю матываў. Уся ж стрыманая і мужная танальнасць спектакля Тэатра Янкі Купалы прама процістаіць жанру сентыментальнай меладрамы.

Абагулены сцэнічны выраз, да якога звяртаецца адзін з найлепшых рэалістычных тэатраў краіны, абапіраецца на моцны падмурак творча пераасэнсаванай жыццёвай праўды. Менавіта таму нават абстрагаваная белая драпіроўка на сцэне пераканальна чытаецца то як памяшканне лабараторыі інстытута, то як вестыбюль басейна для плавання, то як заснежаная прастора зімовай вёскі.

Справа, звычайна, не толькі ў афармленні. Ансамбль выканаўцаў спектакля іграе ў адзіным агульным «ключы», які ляжыць у арганічным адзінстве жыццёвай, часам нават бытавой праўдападобнасці, са свядомым умоўным узбуйненнем характару.

Не ўсім удзельнікам спектакля аднолькава ўдаецца справіцца з гэтай нялёгкай задачай. Артыстка М. Захарэвіч (Галіна), напрыклад, не пераступае ўзроўню бытавой замалёўкі. Але асноўныя выканаўцы — Г. Талкачова, З. Зубкова, В. Тарасаў — умеюць выразна вылучыць галоўныя духоўныя якасці сваіх герояў, не зважаючы на ўсе іхнія раздробненыя вонкавыя паводзіны. Асабліва майстэрская адзінства ў вобразе яскравай бытавой характарнасці з высокімі душэўнымі ўзлётамі дасягае артыст В. Тарасаў. Вышэй ужо гаварылася пра паспяховае папаўненне трупы Тэатра імя Янкі Купалы новымі імёнамі. Спектакль «Выклік багам» — яшчэ адзін доказ гэтага.

Не ўсё, вядома, беззаганнае ў цікавай рабоце тэатра. Павялічаныя вочы каханай, якія неспадзявана выплываюць з аркуша ватманскай паперы на станку для чарчэння, — занадта ўжо дробная і прымітыўная правяа рамантызацыі. Наўрад ці варта некалькі разоў дэманстраваць і ўмоўную мізансцэну «выкліку багам», якая ўжо нагадвалася. Ад празмернага паўтарэння яна траціць эмацыянальнае ўздзеянне і робіцца дыдактычнай. Можна яшчэ знайсці асобныя недахопы, якія ўсё ж не вырашаюць справы, бо ўдалае сцэнічнае ўвасабленне літаратурнага матэрыялу вызначыла ўвогуле поспех паказу.

Тэатр імя Янкі Купалы змагаецца за п'есы. Змагаецца з пазіцыі высокай культуры і патрабавальнасці. Ён узбагачае незавершаныя драматургічныя спробы сваімі шматгадовымі творчымі здабыткамі і вопытам. Такая дзейнасць выдатнага мастацкага калектыву не можа не выклікаць павагі.

В. ГАКЕБУШ.
(«Культура і життя» за 10 ліпеня 1966 г.).

НАРЫС—ЖАНР НАСТУПАЛЬНЫ

Размова аб сучасным нарысе, аб месцы яго ў літаратуры, распачатая нашай крытыкай і літаратуразнаўствам ужо даўно, не заціхае і сёння.

І гэта — знамянальная з'ява. Сама жанравая сутнасць вызначае неабмежаваныя магчымасці нарыса як актыўнага сродка пазнання рэчаіснасці, вызначае яго здольнасць аператыўна занатоўваць непаўторныя рысы часу, выяўляць і даследаваць надзённыя праблемы жыцця. Таму кожны раз з цікавасцю сустракаеш выхад у свет новай кнігі нарысаў.

С. Кухараў не навічок у гэтым жанры. На старонках рэспубліканскіх часопісаў і газет даволі часта з'яўляюцца яго нататкі аб прамысловым і сельскагаспадарчым будаўніцтве на Беларусі.

«Ад вашага карэспандэнта...» — першы зборнік Кухарава, цалкам прысвечаны сённяшняй беларускай вёсцы. Трэба аддаць належнае аўтару: у кола яго назіранняў трапляюць актуальныя праблемы сучаснасці, а таксама адметныя з'явы гістарычнага мінулага. Аб пачатку сацыяльнай і культурнай рэвалюцыі ў краіне, аб стварэнні першай школы-камуны П. Лепяшынскім у в. Літвінавічы апавядае нарыс «Далёкае і блізкае»; «Букет чаромхі» ўваскрашае эпізод гераічнай барацьбы беларускіх партызан супроць акупантаў у гады Вялікай Айчыннай вайны; «Помнік над Дняпром» прысвечаны ляўкоўскаму перыяду жыцця і творчасці народнага паэта Янкі Купалы.

Як станоўчы момант варта адзначыць, што ў «калгасных» нарысах пісьменнік разглядае ва ўзаемасувязі непасрэдна вытворчы і маральна-этычны аспекты той ці іншай з'явы. Гаворачы аб арганізацыі працы, аб пошуках моладдзю сваіх жыццёвых шляхоў, ён засяроджвае ўвагу на духоўных якасцях людзей калгаснай вёскі, для якіх у высокай ступені ўласцівы пачуцці калектывізму, асабістай адказнасці за агульную справу, уменне працаваць творча і натхнёна («Завітайце ў Зарэчча», «Алёшка-брыгадзір», «Залатыя дзявочыя вёсны» і інш.).

У лепшых нарысах, якімі, на наш погляд, з'яўляюцца «Атэстат сталасці», «Люблю цябе, камсамолія», «Букет чаромхі» (асабліва — апошні), аўтар абапіраецца на ўласныя назіранні і ўражанні, менш давяраючы «ўскосным дадзеным». І гэта станоўча ўплывае на агульную атмасферу твораў, накладваючы на іх адбітак натуральнай шчырасці, сапраўднай зацікаўленасці прадметам гаворкі.

Заслугоўвае ўвагі «Букет чаромхі» — амаль адзіны ў зборніку нарыс з акрэсленым сюжэтам. Экспазіцыя тут (разважанні пра чаромху, апісанне бэзу ля хаты дзеда Лаўрыновіча) — гэта той мэтанакіраваны і актыўны па сваёй ролі пункт, які дазваляе адразу ж па асацыятыўнай сувязі ўвесці ў нарыс апавяданне гераіні аб сваім партызанскім мінулым. Выразны кульмінацыйны момант, лаканічная абагульняючая частка замацоўваюць агульную лірыка-драматычную танальнасць твора. Псіхалагізм паргрэтных штрыхоў, напружанне і трапнасць дыялогу і іншыя сродкі мастацкага выяўлення набліжаюць «Букет чаромхі» да апавядання.

Большасць нарысаў зборніка — партрэтныя замалёўкі галоўных герояў (даярка, брыгадзір, старшыня калгаса, сакратар райкома камсамола і інш.). Фактычны матэрыял, трэба сказаць, багаты і ўдзячны, аднак мажлівасці яго выкарыстаны далёка не ў поўную меру.

Галоўны недахоп некаторых нарысаў С. Кухарава — апісальнасць, фактаграфізм, ілюстрацыйнасць. Аўтар хаця і вызначае пэўныя «вехі» на жыццёвых шляхах сваіх герояў, аднак робіць гэта дэкларатыўна, а таму непераканаўча. Ён звычайна называе, канстатуе факт, але не выяўляе, не даследуе яго. У выніку сацыяльны і эстэтычны змест з'явы, які ўтрымлівае ў сабе значныя мажлівасці эмацыянальнага ўздзеяння на чытача, так і застаецца толькі патэнцыяльным зарадам. Творча не пераасэнсаваныя факты ў значнай меры страчваюць і сваю агітацыйную сілу. Ці не таму, нягледзячы на дакладны, паслядоўны пералік падзей, біяграфічных звестак, нарысам часам не хапае дзеяння, дынамікі, наглядна доказнасці, а герояў іх цяжка адрозніць адзін ад другога.

Сапраўды, чым асабіста сваім розняцца паміж сабой калгасныя дзяўчаты Маруся («Завітайце ў Зарэчча»), Ніна («Залатыя дзявочыя вёсны») і Аня («Атэстат сталасці»)? Хіба толькі тым, што першая з іх — даярка, другая — трактарыстка, трэцяя — свінарка...

У выніку перад намі — звычайная карэспандэнцыя, больш-менш ажыўленая выяўленчымі прыёмамі, якая знаёміць з вопытам таго ці іншага перадавіка вытворчасці ў **агульным** плане.

Задача ж нарыса гэтым не вычэрпваецца. Яна ў тым, каб паказаць, як надзённыя жыццёвыя праблемы «праламляюцца» ў **канкрэтных** справах **канкрэтных** людзей — нашых сучаснікаў. Задача нарыса — **па-мастацку** выявіць сацыяльную сутнасць пэўнай з'явы ці факта. А гэта магчыма толькі пры ўмове псіхалагічнага раскрыцця творцы гэтага факта — героя, які ўяўляе сабой характэрны для нарыса, узяты непасрэдна з жыцця **канкрэтны індывідуальны тып**.

Трэба адзначыць таксама, што С. Кухараў, засяроджваючы ўвагу ў асноўным на поспехах, дасягненнях сваіх герояў, не закранае адмоўных фактаў, канфліктаў, якіх яшчэ нямала ў розных галінах нашай гаспадаркі. У сувязі з гэтым хочацца пажадаць аўтару большай грамадзянскай смеласці і прынцыповасці ў асвятленні ценявых бакоў рэчаіснасці, каб ён не толькі занатоўваў жыццё, але і рашуча ўрываўся ў яго, выяўляў яго новыя патрэбы і выносіў іх на суд грамадскасці, бо гэта перш за ўсё і вызначае наступальны характар баявога жанру — нарыса.

Няроўная і мова зборніка. Сустракаюцца лаканічныя, выразныя і свежыя пейзажныя замалёўкі, трапныя, дынамічныя дыялогі («Атэстат сталасці», «Букет чаромхі»). Але фактаграфізм і апісальнасць, характэрныя для большасці нарысаў, знешне выявіліся ў мностве моўных штампаў, у структурнай і танальнай аднастайнасці фразы.

Зборнік нарысаў С. Кухарава — адзін з першых у юбілейнай серыі, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады. Пры значных мастацкіх недахопах кніга заслугоўвае ўвагі. Яна адкрывае чытачу новых герояў, нашых сучаснікаў, якія сваёй штодзённай працай умацоўваюць заваёвы Вялікага Кастрычніка, творча развіваюць рэвалюцыйныя традыцыі, ствараючы прадумовы камуністычнай будучыні.

З добрым густам кнігу аформіў мастак І. Капялян.

А. ЛЫСЕНКА.

Сцяпан Кухараў. «Ад вашага карэспандэнта...» Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1966.

НОВЫЯ ЭСТАМПЫ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ

Я. ЦІХАНОВІЧ. «Ворыва».

СЛОЎНІК СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Вывучэнне гісторыі мовы — неабходная ўмова поўнага і ўсебаковага асвятлення сучаснага яе стану, выяўлення яе спецыфічных граматычных і лексічных рыс. Плённае ж вывучэнне старажытнай мовы, асабліва яе лексікі, практычна немагчыма без адпаведных дапаможнікаў, у першую чаргу без гістарычнага слоўніка. На гістарычны слоўнік, як на фундамент, абапіраюцца самыя разнастайныя даследаванні ў мовазнаўстве, без яго нельга вырашыць рад праблем гісторыі і сучаснага стану мовы. Вялікае значэнне мае гістарычны слоўнік і для гісторыкаў у іх рабоце над старажытнымі тэкстамі, для літаратараў, прававедаў, этнографаў і ўсіх тых, хто займаецца вывучэннем або проста цікавіцца гістарычным мінулым свайго народа. Разам з тым гістарычны слоўнік з'яўляецца важным помнікам культуры народа наогул.

Пытанне аб стварэнні гістарычнага слоўніка беларускай мовы ўжо мае сваю гісторыю. Першая спроба лексікаграфічнай апрацоўкі лексічнага саставу старажытнай беларускай пісьменнасці адносіцца да сярэдзіны мінулага стагоддзя і звязана з імем выдатнага беларускага філолага Івана Іванавіча Насовіча, які падрыхтаваў спецыяльны слоўнік да вядомага збору гістарычных дакументаў «Акты, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі». На жаль, гэтай каштоўнай рабоце Насовіча не суджана было выйсці ў свет, і яна аказалася забытай.

Крокі да падрыхтоўкі поўнага слоўніка старой беларускай мовы былі зроблены ў 20-я гады нашага стагоддзя. У Інстытуце беларускай культуры, дзе ў той час канцэнтравалася даследчая работа па беларускай філалогіі, была створана спецыяльная камісія па падрыхтоўцы гістарычнага слоўніка беларускай мовы. Камісія выпрацавала асноўныя прынцыпы пабудовы слоўніка і прыступіла да збору матэрыялу для яго. Але работа аказалася спыненай у пачатковай стадыі ў сувязі з рэпрэсіямі ў перыяд культу асобы.

Падрыхтоўка гістарычнага слоўніка беларускай мовы зноў была распачата пяць гадоў назад у сектары гісторыі мовы Інстытута мовазнаўства Акадэміі навук БССР. Былі абмеркаваны агульныя прынцыпы пабудовы слоўніка, устаноўлены арыентыровачныя тэрміны работы па этапах і вызначаны храналагічныя рамкі слоўніка і яго крыніцы.

Работа па стварэнню слоўніка складаецца з двух этапаў. Першы з іх — найбольш працяглы і працаёмкі — збор матэрыялу, які ў выглядзе картатэкі павінен змяшчаць не менш мільёна картак. Падрыхтоўку картатэкі намечана завяршыць да 1972 года, пасля чаго можна будзе прыступіць да рэдагавання слоўніка і выдання яго паасобнымі выпускамі ці тамамі.

Слоўнік будзе шматтомным выданнем, дзе ў алфавітным парадку будзе размешчана ўсё лексічнае багацце старажытнай беларускай пісьменнасці. Дакладна вызначыць памер будучага слоўніка па лістажу і па колькасці слоў зараз яшчэ немагчыма.

На сённяшнім этапе работы над слоўнікам найбольшую цяжкасць складае вызначэнне яго крыніц. У старажытнасці разам з пісьменнасцю на беларускай мове на Беларусі перапісваліся і ствараліся творы на царкоўнаславянскай мове. Акрамя таго, пісьмовая мова, якой карысталіся ў старажытнасці, была па сутнасці агульнай для беларусаў і ўкраінцаў. Пры вызначэнні крыніц для слоўніка неабходна з вялікай пісьмовай спадчыны мінулага выбраць толькі тыя помнікі, якія напісаны беларусамі і на беларускай мове.

У выніку папярэдняга вывучэння помнікаў складзены спіс крыніц, які налічвае звыш 300 назваў. У сучасны момант поўным ходам ідзе апрацоўка важнейшых з іх, ужо падрыхтавана картатэка ў 600 тысяч картак. Адначасова праводзіцца работа па выяўленню малавядомых і забытых помнікаў. У гэтым дасягнуты значныя поспехі: у распараджэнні ўкладальнікаў слоўніка зараз ёсць звыш ста старажытных твораў, якія да гэтага часу наогул не былі ў навуковым ужытку.

Трэба адзначыць, што складальнікі гістарычнага слоўніка беларускай мовы знаходзяцца ў выгадным становішчы, дзякуючы таму, што да нас дайшла надзвычай багатая і разнастайная пісьмовая спадчына. Дастаткова напомніць, што ў сярэдзіне XIX ст. у Віленскі цэнтральны архіў было дастаўлена 19224 актавыя кнігі, сабраныя ў гарадах і мястэчках Мінскай, Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў. У Віцебскім архіве ў той жа час захоўвалася 1823 кнігі з розных месц Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Архіў канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага, вядомы пад назвай «Літоўская метрыка», у першапачатковым сваім складзе змяшчаў звыш 550 тамоў дакументаў старажытнага перыяду.

Значная частка гэтых матэрыялаў была выдадзена і дзякуючы гэтаму стала даступнай шырокаму колу даследчыкаў. Аднак асноўная маса старажытнай беларускай пісьменнасці застаецца яшчэ не выдадзенай, яна захоўваецца ў архівах і кнігасховішчах пераважна за межамі рэспублікі.

Наколькі вялікая работа прадстаіць па стварэнню гістарычнага слоўніка беларускай мовы, можна меркаваць па практыцы падрыхтоўкі аналагічных слоўнікаў у іншых краінах. Напрыклад, падрыхтоўка падобнага слоўніка галандскай мовы праводзілася 90 гадоў, шведскай — 77 гадоў і англійскай — 52 гады. Работа па стварэнню слоўніка старапольскай мовы распачалася ў канцы XIX ст., а да сучаснага моманту не выдадзена яшчэ і палавіны слоўніка, прычым старапольскі слоўнік ахоплівае толькі ранні перыяд гісторыі польскай пісьменнасці.

У нашых умовах выхад у свет слоўніка старажытнай беларускай мовы можна значна паскорыць шляхам прыцягнення да гэтай работы вялікага калектыву выкладчыкаў і студэнтаў-філолагаў вышэйшых навучальных устаноў, а таксама іншых аматараў беларускай старажытнасці. У апошні час у збор матэрыялу для слоўніка ўжо ўключыліся выкладчыкі і студэнты некаторых вышэйшых навучальных устаноў. Асабліва хочацца адзначыць добрую работу кафедры беларускай мовы Магілёўскага педінстытута (загадчык кафедры Р. Н. Клюсаў). Над зборам матэрыялу для слоўніка працуюць таксама кафедра беларускай і рускай моў Гродзенскага педінстытута імя Янкі Купалы (загадчык кафедры Т. Ф. Сцяшковіч) і кафедры рускай мовы Віленскага універсітэта імя В. Капсукаса (загадчык кафедры М. М. Закар'ян).

З дапамогай грамадскасці мы спадзяёмся на належным навуковым узроўні ажыццявіць важную работу, якая мае вялікае агульнанацыянальнае значэнне.

А. ЖУРАЎСКІ,
загадчык сектара гісторыі мовы Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР.

Паэтычная ПАВЕРКА

Алесь БАЧЫЛА

З НОВАЙ КНІГІ

■ ■ ■

Ніколі б я ў жыцці не стаў
магнатам —
Не па нутру мне сытых цішыня.
Калі задума ёсць, я сам такі багаты,
Што мне ракфелеры і форды не
раўня.

Майго радка рыфмованага звон
Мне даражэй за кожны іх мільён.

Штогод кладу пакут душу жывую
У кніжку неашчадную сваю...
Над выдумкай стараннa маракую, —
Я ж не бяру, а толькі аддаю.

Не ў золаце, не ў злітках адмысловых
Мае непрацантовыя дары,
Для ўсіх адкрыты насцеж сейфы
словаў,
Каму па сэрцы што—бязбоязна бяры.

Пачуцці не саджаю я за краты,
Дзе цісне сутарэнняў цішыня...
Калі мне пішацца—тады такі багаты,
Што ўсе ракфелеры і форды не раўня.

ПАРАВОЗ

Я зайздрошчу табе, калі мчыш ты
вагоны,
Сцелеш белую грыву між белых
бяроз
І праносішся ў пыле са свістам
і звонам,

І знікаеш у далечы ты, паравоз.
І знікаеш... А ўслед і пачуцці і мары
За табой, за віхурай тваёй
наўздагон...
І ляцяць, без аглядкі мінаюць
выжары,

За адным адплывае другі перагон.
А насустрач слупы ўсё імчацца,
імчацца,
За вярстой адбягае, вільнуўшы,
вярста...
Цяжка зразу крануцца, з прывычным
растацца,
А ўжо там, у імкненні — адна
любата.

Любата; калі свішчуць вятры
раставанняў,
Вытанцоўваюць колы густы
перастук...
Дзеля тысяч знаёмстваў і соцень
спатканняў
Я гатоў заплаціць хоць мільёны
разлук.

У АДНЫМ З ВЕНСКІХ ПАРКАЎ

Здаецца, тут не сонца свеціць,
А ружы — полымем сваім...
Ото б лахва, раздолле дзецям!
Вось дзе б набегацца ўжо імі
Хапіла б кожнаму з ліхвою
Густога водару, красы!..

Але ж у парку — што такое?—
На ўсіх алеях толькі псы.

Іх берагуць, як дар бясцэнны,
Для іх тут столькі пекнаты,
Што ў грэх падумалася: Вена,
Няўжо бяздзетнай стала ты?

Няўжо дашчэнту ўпаў тут попыт
На слодыч радасцей людскіх?
О, не!.. Але ж за лішні клопат
Дзяцей тут лічаць—лепш без іх...

Без іх?.. О, тупасць мешчаніна,
Нікчэмнасць заскаруслых душ!
І патыхнула едкай псінай
Ад белых і пунцовых руж.

■ ■ ■

І вось апошні водбліск згас,
І прыцемак упаў забралам...
Далёка недзе грукатала
Грамамі неба.

Чорны вяз
Яшчэ дрыжаў пад ветрам, быццам
Скідаў маланак сотні тон,
Ніяк не верачы, што ён
Такую ўстояў навальніцу
І ацалеў...

Уздоўж ствала
Глыбока трэшчына бялела,
Як стужка ордэна за смеласць,
Хоць рана свежая цякла...

Яе ніколі напаказ,
Як гандляры ў шыкоўных крамах,
Не выстаўляў ты, дружа вяз.
Упэўнен я: яшчэ не раз
Паслужаць прыкладам для нас
Твае і трэшчыны і шрамы.

ЦЭМЕСКАЯ БУХТА

Мільгае дарога... А ты, як жывая,
То ласку пашлеш, то затоіш дакор,
То мчышся насустрач, то зноўку
знікаеш,
Як тая свавольніца,
ў далечы гор.

А можа ўцякаеш сама ад каго ты
І ўслед, каб адстала пагоня ў пуці,
Стараешся столькі крутых павароту
Між гор і абрываў круцей накруціць?

Ці можа цікуеш патайна ў засадзе,
Каб выйсці раптоўна насустрач таму,
Хто сэрцу твайму абяцае не
здрадзіць, —
І шчыра адкрыцца ў каханні яму?

Таму, то пакажашся з-за павароту,
То спрытна за выступ гары сіганеш...
Цэмеская бухта! І што за ахвота
Круціць па дарозе прыморскай мяне?

Але ўжо... я вочы на ўсё закрываю—
Пятляцю і пятляць хоць да ранняга
гатоў,
Дай толькі маленькі намёк, дарагая,
Што ты мне нарэшце адкрыешся
зноў.

Яўген ЯСВІН. «Бежанцы. 1941 год». (З дыпломных работ выпускніку Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

Артур ЦЯЖКІ

КАРОТКІЯ АПАВЯДАННІ

Калі ў рэдакцыйнай пошце сустракаеш вершы ці апавяданні і, прачытаўшы іх, знаходзіш нешта адменнае, свежае, — радуешся, як цікавай сустрэчы, цікаваму знаёмству. Гэтак адбылося, калі я раскрыў пісьмо з воінскім штампам на канверце і знайшоў у ім кароткія апавяданні за подпісам Артура Цяжкага. Прачытаў іх, і прыйшло нейкае ціхае задавальненне. Яны сведчылі, што аўтар іх — будучы апавядальнік. Кажу «будучы», бо гэтыя апавяданні — толькі першая заяўка, якая гаворыць аб тым, што Артур Цяжкі — здольны чалавек, што ён любіць роднае слова, умее бачыць жыццё і выбіраць у ім тое, што варта пяра пісьменніка.

Артур Цяжкі — родам са Смаргоншчыны. Яму дваццаць тры гады. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў крыху супрацоўнікам раённай газеты, цяпер служыць у Савецкай Арміі.

Хочацца ад душы пажадаць яму поспехаў на нялёгкім шляху творчасці.

Раман САБАЛЕНКА.

БУЛЬБА

Чапляючыся жыватамі за вяршыні акацый, плывуць на ўсход набрынялыя, цяжкія хмары. Пранузлівы вецер забіраецца пад крысе шыняля, і па ўсім целе прабягаюць колкія дрыжыкі. Холадна. Але калі тупаць і тупаць бесперастанку — можна трываць.

З правага боку — двухметровая дашчатая агароджа, уздоўж яе — ледзь прыкметная ў цемрадзі сцяжынка. Крок за крокам, круг за кругам ходзіш гэтай сцяжынкай. І што толькі не прыпомніш у такі час! А калі ўсё перадумана ўжо і ўспамінаць няма чаго, тады з самых патаемных куточкаў памяці адкопваеш звычайныя будзённыя дробязі маленства, роднага дому...

Нешта вельмі доўга няма змены. Над галавой, у голых кронах дрэў, шастае вецер, зрывае апошнія ўцалелыя лісты. Упэўніўшыся, што ніводнага лісціка не засталося, са злосцю разрывае калматую завесу хмар. У праталіну, велічынёй з салдацкую шапку, на момант выглядае месяц. Тады ўсё наваколле ўсміхаецца нейкай змучанай, соннай усмешкай. Краем вока заўважаю, як паблісквае за плячом штык. Спыняюся. Абрываюцца думкі. Зноў становіцца нудна і холадна.

А змены ўсё няма і няма. Хутчэй бы ў каравулку. Там цёпла, утульна. Можна выцягнуцца на вышмальцаваным тапчане і слухаць, як ныюць натруджаныя ногі.

І раптам — крокі. Пэўна, змена. Па звычцы мацней сціскаю рамень карабіна, аклікаю:

— Стой! Хто ідзе?

У адказ добра знаёмы голас:

— Начальнік каравула са зменай...

У каравулцы паліцца грубка. Наўкола сядзяць хлопцы. Нехта падсоўвае мне табурэтку і міску з печанай бульбай. Бульба свежая, з прысаку.

Самы бесталковы салдат нашага ўзвода Махарадзе ляпае мяне па плячы і з добрай усмешкай гаворыць:

— Джыгаро, а, джыгаро, — і, кіўнуўшы на бульбу, дадае: — беларуская.

Адно толькі слова, а як жа моцна запахла бацькаўшчынай, вёскай, родным домам. «Джыгаро» — па-грузінску — друг, сябра. Сорамна стала, што я так часта смяяўся з Махарадзе, што іншы раз крыўдзіў яго. Хочацца сказаць яму нешта прыемнае, харошае.

Бульба гарачая, сопкая і смачная-смачная.

ПРАЛЕСКА

Васільковага колеру аўтобус ідзе ў кірунку Даўгінцава. Мякка шамацяць колы па асфальтаванай, вымытай вясеннімі ліўнямі дарозе. Вечарэе. Сонца — чырвонае і вялізнае — збіраецца шуснуць за гарызонт. Налітыя макавай чырванню апошнія промні залацяць дрэвы старога саду, што бяжыць уздоўж дарогі.

Багата садамі Днепрапятроўшчына. Іншы раз вёрст пяць-дзесяць едзеш, а ўсё сад цягнецца. Глядзіш на яго з акна аўтобуса і здаецца, што радкі дрэў — бясконцыя спіцы вялізнага кола, якое ўсё круціцца і круціцца.

На зямлю прыйшла вясна. У садзе людзі беляць ствалы яблынь, зграбаюць леташняе лісце, паляць смецце. Густы шэры дым падымаецца слупам угару і знікае дзесьці ў бяздонным блакіце. Над садам, над усім наваколлем плыве поўная шчасця і пяшчоты песня:

Ой вы, очі волошкові...

Хораша, калі людзі спяваюць, калі вакол вясна, радасць і шчасце. Дыхаецца свежа і лёгка, на ўсе грудзі. Хочацца выскачыць з гэтага аўтобуса, скінуць шынель і да салодкай знямогі працаваць у гэтым садзе, з гэтымі людзьмі.

Дарога — як страла. Імчыць па ёй наш васільковы аўтобус, круціцца кола саду, мільгаюць спіцамі радкі дрэў.

Побач са мной садзіцца дзяўчына. Што зробіш, маладосць бярэ сваё — краем вока разглядаю яе. Апранута па-рабочаму: спяцоўка і штаны. Штаны, праўда, не зусім рабочыя — сапраўдныя «дудачкі», старанна выпрасаваныя. З-пад ружаватай касынкі на высокі, пукаты лоб выпаўзла пасма цёмных валасоў. Вясенні лёгкі загар паспеў крануць яе не дужа прыгожы, але малады сімпатычны кірпаты твар. У левай руцэ трымае пралеску. Кволая сцяблінка абгорнута аўтобусным білетам. Мне прыемна і крыху трывожна. А яна хоць бы што. Быццам і не заўважае, што побач сядзіць салдат. Хоць бы раз зірнула.

Аўтобус сцішыў бег, спыніўся. Мая суседка паднялася і пайшла да выхаду.

Аўтобус зноў імкліва размаўляе з вымытай, бліскучай шашой, але нечага быццам нестае. Раптам да мяне падыходзіць кандуктарка і неяк урачыста, на ўвесь аўтобус кажа:

— Вось гэтую кветачку прасіла перадаць вам дзяўчына, што сядзела побач.

Чырвань заліла мае шчокі, стала душна. Я асцярожна ўзяў загорнутую білетам сцяблінку пралескі і збянтэжана паглядзеў у акно. Пасажыры, усе як адзін, таксама павярнуліся да акна, паказваюць:

— Вунь яна, вунь!

Дзяўчыны нідзе не відно...

Вясеннюю кветку — пралеску — я прывёз у казарму.

МАЛЕНЬКІ ЭПІЗОД

Першага спаткаў Яўхіма Сымонавіча. Той выйшаў з кошыкам, відаць, кіраваўся на агарод, нарваць свінням бацвіння. Убачыўшы мяне, апусціў на зямлю кошык, заспяваў:

— Э-э-э, ці не Юзэфы Катляровай сын?.. На пабыўку?.. Во, пане мой, радасці матцы будзе... Але чаму ж гэта пагоны чыстыя? Здаецца ж, і граматны...

— Не заслужыў.

— Тэк-тэк... То хадзем, можа, у хату? Не хочаш? А то зайшлі б, недзе і чарка ёсць.

— Другім разам.

— Ну, як хочаш. Тады давай закурым. Я цябе такім самасадам пачастую. Га?.. То-та ж, брат, я ведаю, што вам такога не даюць.

Курым. Гляджу на Яўхіма Сымонавіча і прыгадваю адзін эпізод.

За нашай вёскай, між разложыстых клёнаў, доўгі час стаяў зачынены мураваны касцёл. Бабкі ў журбе глядзелі на вялізны заржавелы замок, хрысціліся, ківалі галовамі, шапталі малітвы.

І бог пачуў іх малітву — касцёл адчынілі. Адчынілі камсамольцы. Тры дні гуло тады велізарнае памяшканне касцёла. Хлопцы стукалі малаткамі, шоргалі піламі. Над уваходам павесілі шыльду: «Клуб калгаса «Малінаўка».

Тады Яўхім Сымонавіч бегаў па вёсцы як ашалелы і крычаў:

— Вось папомніце маё слова, парафіяне! Той, хто першым танцаваць пойдзе, — слупам стане. Бог не даруе!

І трэба ж было так здарыцца, што першай пайшла ў скокі ў новым клубе яго дачка Зоська. Смаліла дзеўка аж да сёмага поту і хоць бы што.

А праз месяцы два і Яўхім Сымонавіч прыйшоў у клуб — паглядзець, як яго Зоська са сцэны будзе выступаць. Нясмела так зайшоў, ціхенька пратачыўся між людзей і прытуліўся да сцяны, у куточку, каб лішне на вока не вылазіць. А тут якраз сусед Ясь Чорны:

— Яўхім? І ты?..

Той махнуў рукой:

— Ат, цяпер, мабыць, і бог заадно з гэтымі анціхрыстамі...

АДНОЙЧЫ НОЧЧУ

Па бляшанаму даху казармы галопам скача асенні дождж. Ліжа шыбы вакон. Дзесьці ў вадасточнай трубе забытым шчанём скуголіць вецер. Свавольнік гэты вецер. Сарве з таполі ахапку васковых лісцяў, шпульне ў непраглядную цемрадзь і заціхне на момант, быццам любуючыся, як яны, чысценькія, апаласканыя дажджамі, падаюць у ліпкую гразь.

Другая палова ночы, а не спіцца. Дарэмна я стараюся заснуць: ад гэтага толькі паколвае ў скронях. А думкі — як тое лісце за акном.

Зноў сотні вёрст жывеш ты. Цікава, ці спіш ты цяпер? Мусіць, не спіш. Мусіць, сядзіш за сталом, накінуўшы на плечы цёплую, шарсцяную хустку, і правяраеш сшыткі.

Чаму так доўга няма ад цябе пісем? Чаму ты не напішаш, як там у роднай старане калыша вецер бярозку, як там святкавалі залатую восень, як выглядае цяпер наш лес, той самы лес...

Помніш, — гэта было два гады назад, якраз у восень, калі ты праводзіла мяне на службу. Адзелю раніцой, калі яшчэ драмала маладая руна, у лёгкай павалоцы туману, мы пайшлі з табою ў лес. Дацвітаў верас, пахла настоем трыгіліцы і апалага лісця. Ты папрасіла ў мяне складанчык, зрэзала доўгі гнуткі дубец і пачала нанізваць на яго лапчатыя лісты клёну.

Я вялізнай елцы сіганула ў дупло вавёрка. Я спрабаваў палезці на тую елку, але метры за два ад зямлі сучок пада мной абламаўся і я, пад твой задзірысты смех, зваліўся на зямлю. Ты ласкава выцірала вымазаную ў гразь маю шчаку і, прама ў твар, смяялася чыстым здаровым смехам. Якая ж ты была прыгожая і слаўная! І я, нечакана для самога сябе, раптам пацалаваў цябе. Першы раз. Пацалаваў і неяк спалохаўся гэтага. Але ты не адпіхнула мяне, а толькі апусціла галаву.

Асенні дождж галопам скача па бляшанаму даху казармы, ліжа шыбы вакон. Нехта схіляецца над мной:

— Гардзіевіч, ты не спіш? На сёмым кіламетры абрыў лініі, а такарным майстэрням патрэбна ітло. Прыйдзецца ісці...

Гэта наш старшына. Абрываюцца салодкія мары ўспамінаў. Я падымаюся, апранаюся і на мках кажу табе: «Ты ўжо спі, Тома! Канча аяраць сшыткі і кладзіся. А я пайду. Так трэба. Нічога, што на двары вецер і дождж. Такая ша салдацкая служба...»

КОЖНАМУ ГОРАДУ — СВОЙ ГЕРБ

На адным з чарговых пасяджэнняў секцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Саюза мастакоў БССР, калі абмяркоўваліся прапановы па падрыхтоўцы да святкавання 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і 900-годдзя Мінска, зайшла гаворка аб беларускай геральдыцы. Была выказана слушная думка, што неабходна распрацоўваць і выпускаць на прадпрыемствах мастацкай прамысловасці рэспублікі сувеніры з адлюстраваннем гістарычных помнікаў, а таксама гербоў гарадоў і абласцей Беларусі.

Але пакуль што мы не маем афіцыйна зацверджаных новых гербоў нашых гарадоў, раёнаў, абласцей. На наш погляд, зрабіць гэта трэба неадкладна. Калі мы возьмем новыя гарады рэспублікі, якія ўзніклі за гады Савецкай улады, дык нават і яны, нягледзячы на сваю маладосць, заслужылі працоўным і баявым гераізмам права мець свае гербы. Варта было б прааналізаваць, наколькі старадаўнія гербы гарадоў адпавядаюць па сваёй сімволіцы нашаму часу, вырашыць, якія новыя элементы патрэбна ўнесці ў іх. Думаецца, што многія старыя гербы не страцілі значэння да нашых дзён і патрабуюць нязначных змен, бо яны ў свой час прысвойваліся за воінскую ці працоўную доблесць і адлюстроўвалі характэрныя, непаўторныя рысы таго ці іншага горада, якімі мы даражым і сёння. На гербах Віцебска, Полацка, Рэчыцы, Слуцка, Слоніма, Гарадка, напрыклад, — знакі воінскай доблесці, гераічных подзвігаў нашых продкаў, якія ўдзельнічалі і ў разгроме нямецкіх рыцараў пад Грунвальдам у 1410 годзе і ў больш позніх вялікіх гістарычных падзеях. Герб горада Чавусы сведчыць пра ўдзел беларускіх воінаў у бітве са шведскімі захопнікамі ля вёскі Лясной.

З тых часоў многае змянілася. Упісаны новыя слаўныя старонкі ў нашу гісторыю — асабліва ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, а таксама ў гады мірнай стваральнай працы савецкага народа. Новыя гербы нашых гарадоў павінны расказаць і пра мінулае, і пра сучаснае.

Геральдычныя знакі — не проста ўпрыгожванне. Яны спрыяюць выхаванню патрыятычных пачуццяў, пачуццяў гонару за свой горад, раён, рэспубліку, напамінаюць пра тое, чым мы павінны ганарыцца, — пра славу нашых дзядоў і бацькоў, пра іх баявыя і працоўныя подзвігі ў імя Айчыны.

Адсутнасць нацыянальных геральдычных сімвалаў часта прыводзіць да таго, што нашы беларускія турысты, спартсмены, вучнёўская і студэнцкая моладзь упрыгожваюць сваё адзенне, дарожныя сумкі і чамаданы, веласіпеды і матацыклы сімваламі самых розных замежных дзяржаў. Вельмі крыўдна, што наш гандаль, наша прамысловасць па сённяшні дзень не могуць прапанаваць моладзі свае, нацыянальныя эмблемы, больш высокія па мастацкіх вартасцях, больш выразныя, больш цікавыя.

А між тым выправіць існуючае становішча не так цяжка. Тут трэба ўлічыць і творчы вопыт братніх рэспублік. Вось хоць бы ў Смаленску да 1100-годдзя горада выпусцілі юбілейны значок з яго гербом. Майстэрні Мастацкага фонду Літоўскай ССР вырабляюць цікавыя значкі з гербамі гарадоў і сімваламі гістарычных памятных мясцін.

Нашы замежныя сябры таксама ўважліва ставяцца да захавання сваіх нацыянальных традыцый. У Варшаве, напрыклад, сірэна з мячом — герб горада — сустракае пры ўездзе ў сталіцу краіны. Гэты ж герб — і на раменьчыку гадзінніка і г. д.

Асобныя элементы гербоў можна было б выкарыстоўваць для маркіравання тавараў нашых прамысловых фірм і пры вырашэнні інтэр'ераў магазінаў, рэстаранаў, кафэ, дзіцячых устаноў, піянерскіх лагераў.

Эмблемы з гербамі маглі б насіць і школьнікі — у выглядзе значка, нарукаўнага знака, наклейкі на ранец.

Гарадскі герб можа быць і на фасадзе чыгуначнага вакзала, і на пачцы цыгарэт. А чаму б, напрыклад, поезд «Беларусь» не ўпрыгожыць гербамі беларускіх гарадоў?! Тое ж можна сказаць пра аўтобусы міжгародніх рэйсаў, пра судны рачнога флоту.

Асобныя элементы геральдычных сімвалаў можна ўвесці ў беларускія арнаментальныя матывы на самых разнастайных вырабах нашай мастацкай прамысловасці. Яны ўзбагацілі б наш нацыянальны арнамент.

Сёння геральдычныя знакі распрацоўваюць толькі асобныя энтузіясты. Ніхто не накіроўвае іх творчых пошукаў. Нам здаецца, Міністэрства культуры БССР і Саюз мастакоў БССР павінны аб'явіць конкурс на новае вытлумачэнне гістарычных, ужо існуючых гербоў, а таксама на стварэнне новых гербоў нашых гарадоў.

Пра гэта неабходна падумаць тым больш, што мы рыхтуемся да 900-годдзя Мінска.

А. ЛАУРЭНЦЬЕЎ,
Ф. ВАЛАДЗЬКО.

ВІНШАВАННІ ЮБІЛЯРА

Аматарам музыкі і спеваў Прынёманскага краю добра вядома імя Антона Міхайлавіча Валынчыка. Амаль 50 год аддаў ён папулярызацыі беларускай народнай песні, удзельнічае ў стварэнні новых харавых калектываў, піша новыя песні на словы класікаў і маладых беларускіх паэтаў. Антону Міхайлавічу абавязаны сваімі поспехамі многія калектывы мастацкай самадзейнасці Гродзеншчыны, у тым ліку ансамбль песні і танца «Нёман», хор настаўнікаў Гродна, Смаргонскі ансамбль песні і танца імя Агінскага, Дзяляліцкая харавая капэла, хор сяла Збляны і многія, многія іншыя.

Нядаўна працоўныя Гродна адзначылі 70-годдзе з дня нараджэння заслужанага дзеяча культуры БССР А. М. Валынчыка. У адной з аўдыторый педагагічнага інстытута, у якім ён працуе выкладчыкам, адбылася ўрачыстасць, прысвечаная гэтай дате. Юбіляра цёпла павіншавалі сакратар абкома КПБ А. І. Ульяновіч, намеснік дырэктара рэспубліканскага Дома народнай творчасці Д. А. Гарачун, удзельнікі самадзейных калектываў, таварышы па рабоце ўручылі яму памятныя падарункі.

На здымку: дырэктар Гродзенскага абласнога Дома народнай творчасці заслужаны дзеяч культуры БССР А. К. Шыдлоўскі (злева) ўручае А. М. Валынчыку памятны адрас.

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

ГІМН РЭВАЛЮЦЫІ

Вядомы савецкі рэжысёр Рыгор Аляксандраў, адзін з супрацоўнікаў Сяргея Эйзенштэйна ў стужцы «Кастрычнік», цяпер заняты работай па аднаўленню гэтага фільма і падрыхтоўкай да выпуску яго на шырокі экран. У артыкуле расказваецца пра гэтую адну з самых значных з'яў маладой савецкай кінематаграфіі.

14 сакавіка 1928 года на экраны СССР выйшаў фільм Сяргея Эйзенштэйна «Кастрычнік». Карціна стваралася да дзесяцігоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі і патрабавала ад яе стваральнікаў вялікай творчай напружанасці.

Цэлы год старанная працы прынёс стужцы заслужаны поспех. Гісторыя стварэння «Кастрычніка» — прыклад рэвалюцыйнага энтузіязму, мастацкай дапытлівасці многіх савецкіх кінематаграфістаў.

Сяргей Эйзенштэйн доўга збіраў вялікі дакументальны матэрыял, першапачаткова звярнуўшыся да славутай кнігі Джона Рыда «10 дзён, якія ўзрушылі свет». Ён уважліва вывучаў жывыя расказы і ўспаміны многіх удзельнікаў кастрычніцкіх дзён. У Ленінградзе Эйзенштэйн, Рыгор Аляксандраў і іх памочнікі літаральна ішлі па слядах рэвалюцыі. Яны шмат разоў пабывалі ў Смольным, Зімнім палацы, Петрапаўлаўскай крэпасці, агледзелі многія дамы, масты, вуліцы.

Максім Штраух, галоўны асістэнт рэжысёра па падбору тыпажоў і рэквізіту, быў заўзятым прыхільнікам гістарычнай дакладнасці і праўдзівасці найдрабнейшых дэталей. У фільме здымаліся многія ўдзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Напрыклад, Мікалай Падвойскі—у мінулым старшыня Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта — іграў самога сябе.

Доўга шукалі тыпаж Керанскага, і, нарэшце, высветлілася, што яго зможа выканаць на экране студэнт Ленінградскага інстытута гісторыі мастацтваў Папоў.

А галоўны аператар Эдуард Цісэ іграў у фільме эпізадычную ролю нямецкага салдата. На ролю Леніна быў запрошаны вельмі падобны вонкава на правадыра рэвалюцыі ўральскі рабочы Уладзімір Нікандраў.

Эйзенштэйн імкнуўся да гранічнай гістарычнай праўды. Сцэнарый фільма быў прачытаны вялікай аўдыторыі старых бальшавікоў і ўдзельнікаў Кастрычніка. Гэта дало магчымасць унесці ў сцэнарый неабходныя змены і дадаткі.

Выдатны аператар Анатоль Галаўня ўспамінае: «Масоўкі Эйзенштэйна былі настолькі грандыёзныя, што Пудоўкін, які прыехаў у Ленінград на здымкі «Канца Санкт-Пецярбурга», трошкі засумаваў, бо Эйзенштэйн у нечым апярэдзіў яго задуму».

Карціна «Кастрычнік» ахоплівае падзеі з лютага 1917 года, уключаючы ўзяцце Зімняга палаца і II з'езд Саветаў.

Мы знаходзім у фільме першыя і цудоўныя ўзоры мастацкага дакументалізму. Падзеі Кастрычніка пададзены дакладнай мовай «вобразнай публіцыстыкі». Гэта не хроніка, а хутчэй кіналетапіс дзён, якія ўзрушылі свет. Захапіўшыся маштабнасцю рэвалюцыйных падзей, Эйзенштэйн свядома адышоў да камернага падыходу да гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы. Ён зрабіў галоўны акцэнт на рытмах, пафасе і размаху народнай рэвалюцыі.

У сакавіку 1928 года «Комсомольская правда» надрукавала артыкул Анатоля Луначарскага, які назваў «Кастрычнік» сапраўднай паэмай, «ахопленай, бясспрэчна, таленавіта знойдзеным рытмам».

Ляон Мусінак, які глядзеў фрагменты «Кастрычніка» ў 1927 годзе, лічыў фільм лірычнай эпапеяй, якая здзіўляе максімумам экспрэсіі, дакладным дынамізмам мантажу і здзіўляючай пластычнасцю вобразаў. Адна з лепшых у рытмічных і мантажных адносінах—сцэна штурму Зімняга палаца. Марш штурмуючых калон, выдатна перададзены шматпланавымі кампазіцыямі кадра, разнастайнымі ракурсамі дынамічных масавых сцэн ля варот Зімняга, на плошчы, у калідорах палаца.

І нечакана ўзнікаюць на экране крэслы, у якія кінуты скамечаныя паліто і капелюшы членаў Часовага ўрада, і гэты кадр канчаткова вырашае лёс «былой» улады ў вачах гледача.

У «Кастрычніку» са здзіўляючай дасканаласцю выявілася здольнасць Эйзенштэйна мысліць кадрамі.

Нумары «Праўды», што плывуць па рацэ, лаканічна расказваюць пра часовую перамогу рэакцыі, якая разграміла рабочую газету. Мора кос, што праплываюць на экране, вінтоўкі, штыхамі ўваткнутыя ў зямлю,—выдатныя сімвалы масавасці рэвалюцыйнага настрою ў вёсцы і на фронце.

Цудоўны светлажывапіс аператара Цісэ, які спалучаў у многіх кадрах яркую графічнасць з драматычным кантрастным паказам. Сцэна выступлення Леніна на браневіку ля Фінляндскага вакзала зроблена з яркім светлавым акцэнтам. Дарэчы сказаць, вобраз Леніна ў выкананні Нікандрава не стаў удачай, але ў гісторыі кіно—гэта першая спроба ўзнаўлення вобраза праваднра на экране.

Карціну «Кастрычнік» станоўча ацанілі такія выдатныя прадстаўнікі рэвалюцыйнага руху, удзельнікі Кастрычніцкіх падзей, як Падвойскі, Лепяшынскі, Фелікс Кон. Добрыя водгукі аб фільме далі Крупская, Луначарскі, кінематаграфісты Пудоўкін, Кізінцаў, Трауберг. Вось што сказаў пра карціну Пудоўкін: «Яе не толькі будуць глядзець і запамінаць, яе будуць запісваць і па ёй будуць вучыцца».

Аркадзь БЕРНШТЭЙН,
кіназнаўца.
(АДН).

Не аб адным хлебе...

ДАЛЯГЛЯДЫ ЧАПАЕЎЦАЎ

СТАРШЫНЁЙ калгаса імя Чапаева Максім Аляксандравіч Клімянок працуе ўжо трынаццаць год. За гэты час вялікія змены адбыліся ў гаспадарцы. Яна стала адной з лепшых у раёне.

Сакрэт поспехаў—у клопатах аб людзях, іх жыцці і побыце. У далёкім, як цяпер здаецца, 1953 годзе Верхняе мела сумны малюнак—якіх два дзесяткі старых хат, крытых саломай, нідзе ні кусточка. Балота падступала да самай вёскі, а гару, ля падножжа якой прытулілася вёска, называлі Лысай, бо ніколі на ёй нічога не расло.

А сёння Верхняе патанае ў зеляніне садоў, у кветках. Абапал вуліц выстраіліся цагляныя дамы, на будаўніцтва якіх калгас выдаткаваў 60 тысяч рублёў. Не відаць старых калодзежаў—устаноўлены водаправодныя калонкі. У добрым памяшканні знаходзіцца фельчарска-акушэрскі пункт. Пабудаваны сталовая, лазня, ёсць стадыён з футбольным полем, бегавымі дарожкамі, пляцоўкамі для спартыўных гульняў. Вёску ўпрыгожвае штучнае возера, якое з'явілася на месцы былога балота. Вакол возера весела шапоча лістота маладога парку. Лысая гара цяпер не тая, яна абсаджана дэкаратыўнымі дрэвамі. І называюць яе цяпер Фестывальнай, бо тут праходзяць народныя святы—вясны і працы, заработай восені, зімы. У цэнтры вёскі былее вялікі тыпавы будынак. Гэта — сярэдняя школа, крыху далей—калгасны клуб.

Гэтыя змены — вынік настойлівай барацьбы калгасных актывістаў на чале з Максімам Аляксандравічам, камуністаў і камсамольцаў за новую вёску. Ёсць такі выраз: культурны фронт. На першым часе сапраўды, нібы на фронце, даводзілася заваёўваць кожны новы рубеж. Цяжкасці выклікаліся не толькі эканамічным становішчам гаспадаркі. Даводзілася весці барацьбу з няправільнымі поглядамі, нібыта спачатку трэба ўзняць эканоміку калгаса, а культура—гэта другараднае, яна, маўляў, пачакае.

— Жылі без клуба і яшчэ пражывём. Ёсць у нас больш неадкладныя справы,—гаварылі некаторыя калгаснікі на пасяджэнні праўлення, калі абмяркоўвалася прапанова старшыні распачаць будаўніцтва клуба.

Цяпер нават самыя недаверлівыя, асцярожныя людзі зразумелі, як яны памыляліся, калі сцвярджалі, што будаўніцтва культурна-бытавых аб'ектаў затармозіць развіццё эканомікі калгаса.

За апошнія пяць год на культурна-бытавое будаўніцтва калгас выдаткаваў 500 тысяч рублёў. Але гэтыя выдаткі акупляюцца: расце культурны ўзровень, свядомасць калгаснікаў. Сёння глыбокім пераконаннем кожнага чапаеўца стала народная мудрасць—не аб адным хлебе дбае чалавек. У калгаснікаў абудзілася прага да ведаў, да культуры. З 1954 года колькасць спецыялістаў з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй павялічылася ў калгасе ў дзевяць разоў. А работнікаў, якія маюць кваліфікацыю,—у 18 разоў.

Змены ў духоўным жыцці калгаснікаў адчуваеш асабліва, калі бачыш, як ледзь не штовечар у клуб на рэпетыцыі ідуць дзесяткі самадзейных артыстаў. За апошнія гады калгасныя артысты паставілі «Паўлінку», «Лявоніху на арбіце», «Чырвоныя кветкі Беларусі», «Несцерку» і іншыя спектаклі. Самадзейны драматычны калектыў працуе дружна, зладжана. Гледачы высока ацэньваюць майстэрства калгаснага хору, вакальных груп, танцораў, аматараў мастацкага чытання. У гэтым вялікая заслуга загадчыцы клуба Маіны Ермаловіч.

Гурткі мастацкай самадзейнасці ствараюцца і ў брыгадах. Усяго ў калгасе каля ста самадзейных артыстаў.

Рашэнні XXIII з'езда КПСС адкрылі перад чапаеўцамі новыя далягляды. Пяцігадовы план развіцця культуры і быту калгаса, які тут распрацаваны, наблізіць вёску да ўзроўню гарадскога жыцця. Першым годзе пяцігодкі на новай вуліцы плануецца распачаць будаўніцтва двухпавярховых дамоў з усімі выгодамі—водаправодам, цэнтральным ацяпленнем і газам. Сёлета ўступяць у строй дзіцячы сад і яслі, камбінат бытавога абслугоўвання, гасцініца, аўтаматычная тэлефонная станцыя. Будзе газіфікавана 50 кватэр калгаснікаў. Ёсць яшчэ адна задума — ў чапаеўцаў—пабудаваць калгасны дом адпачынку, ужо нават і месца выбрана.

Асабліва вялікая ўвага ў пяцігадовым плане аддаецца будаўніцтву клубаў. Прыгожыя цагляныя клубы ўзводзяцца ў паляводчых брыгадах. А на будаўніцтва Палаца культуры ў Верхнім ужо выдаткавана больш ста тысяч рублёў. Сёлета яно будзе закончана. У клубе будуць вялікая гледзельная і танцавальная залы, прасторнае фае, більярдная, бібліятэка, пакоі для заняткаў гурткоў мастацкай самадзейнасці.

В. ЛЯВОНЕНКА.

Глыбоцкі раён.

У Мінску працягвае свае гастролі Кіеўскі дзяржаўны акадэмічны ўкраінскі драматычны тэатр імя Івана Франка. Сцэну са спектакля «Спыніцесь» па п'есе І. Рачады вы бачыце на здымку. У ролях (справа налева): Анны фон Рыхтэр—народная артыстка СССР Н. Ужвій, Эльзы Рахенау — М. Крапіўніцкая, Штумберга-Бычэўскага — заслужаны артыст УССР В. Дашэнка.

ЗБІРАЛЬНІК БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Наўрад ці сустрэнеш на Тураўшчыне чалавека, які б не ведаў ці хоць бы не чуў пра Парфена Антонавіча Шчакатовіча — дырэктара мясцовага краязнаўчага музея. Працуе Парфен Антонавіч у Тураве з 1950 года і за гэты час зрабіў вельмі шмат, наб музей стаў адным з самых любімых месц і тураўцаў, і шматлікіх турысцкіх і экскурсійных груп.

А яшчэ вядомы Парфен Антонавіч як дбайны збіральнік беларускага фальклору. Ім запісана, у прыватнасці, 255 слоў для дыялектнага слоўніка роднай мовы, зроблены шматлікія запісы народных песень, прымавак, прыказак, народных паданняў.

Добрую, патрэбную справу робіць энтузіяст Парфен Антонавіч Шчакатовіч.

В. ЛОУГАЧ.

Жыткавіцкі раён.

ЭКЗАМЕН НА ЦЫРКАВОЙ АРЭНЕ

У вузкім калідоры на адным баку дзверы з шыльдачкаю «Настаўніцкая», на другім — выхад на цыркавую арэну. Тонуць у паўзмроку рады пустых крэслаў, і толькі пад купалам свецяцца некалькі лямп. Заканчваюць рэпетыцыі паветраныя гімнасты. Арэна аддаецца цяпер групе эквілібрыстаў, якіх зменяць жанглёры, а тых — канатаходцы. І так яны рэпеціруюць, змяняючыся, увесь дзень, да вечара, калі арэна асветліцца яркімі агнямі, зайграе ўрачысты марш і пачнецца цыркавы паказ.

Артысты рыхтаваліся да яго чатыры гады. Займаліся жанглiраваннем і фізікай, гісторыяй і эквілібрыстыкай, гімнастыкай і літаратурай, музыкай і хіміяй. Усе гэтыя прадметы ўваходзяць у вучэбную праграму Дзяржаўнага вучылішча цыркавога і эстраднага мастацтва. У тых, хто яго канчае, агульная адукацыя ў аб'ёме дзесяцігодкі плюс кваліфікацыя артыста цырка. Права на такую прафесію абараняюць перад экзаменацыйнай камісіяй 32 студэнты выпускнога курса.

Тут не выручыць шпаргалка, не паможа падказка. Спадзявацца можна толькі на сябе, на свой спрыт, сілу, майстэрства. Выпускны паказ старанна шліфуецца. Трэба прывыкнуць да грыму, да новых касцюмаў, да новага рэквізіту, спрацавацца з аркестрам, звыкнуцца з тым, што зала не пустая, як у час рэпетыцый, а запоўнена публікаю.

— Быць артыстам цырка, — сказаў нам рэжысёр-педагог Юрый Гаўрылавіч Мандыч, — гэта значыць умець рабіць амаль немагчымае. Рабіць тое, для чаго патрэбен гранічны спрыт, бездакорнае валоданне рэсурсамі сваіх мышц і, нарэшце, фанатычная захопленасць цыркам.

У дырэкцыі нам далі даведку: 50—70 працэнтаў складу любой цыркавой групы з'яўляюцца выпускнікамі вучылішча. Многіх з іх добра ведаюць за рубяжом. Клоуны Алег Папоў і Карандаш (Румынія), майстры пантамімы Леанід Енгібараў і Барыс Амарантаў, паветраныя гімнасты Бубновы, жанглёры Хромавы, скакун-акрабат Іван Фядосаў, эквілібрысты з шастамі Французавы — ім апладзіравалі гледачы соцень гарадоў. І вось разам з такімі прызнанымі майстрамі цыркавой арэны давядзецца працаваць тым, хто заканчвае вучылішча. Але педагогі ўпэўнены, што іх выхаванцы не падвядуць. Выпуск гэтага года вельмі моцны. У праграме выпускнога паказу ёсць нумары, якіх яшчэ ніхто ў свеце не рабіў.

«На манежы юнацтва» — так называецца гэтая праграма. Сярэдні ўзрост выпускнікоў каля 20 год. Ім памагаюць у ходзе паказу студэнты малодшых курсаў працуючь уніфармістамі, аб'яўляюць нумары. Так выхоўваецца пачуццё адзінага калектыву — адна з асноўных традыцый вучылішча і наогул савецкага цырка.

Пра ўсе нумары праграмы, вядома, не раскажаш. Вось некалькі з іх. Пластыка-акрабатычны эцюд Люды Крыхелі глядзіш, затаіўшы дыханне. Кволая, мініяцюрная акрабатка выконвае сілавыя практыкаванні, за якія браліся да гэтага часу толькі мужчыны.

Ала Абрамава працуе на шаснаццаціметровай вышыні, пад самым купалам. Да перакладзіны трапецыі прымацоўваецца вертыкальны стрыжань. На канцы яго круглая пласціна, як шапка ў грыба. Ала нахіляецца да яго, робіць стойку на галаве. Гэта вельмі цяжкі трук. Бацька Алы, стары эквілібрыст, ветэран цырка, зайздросціць дачцы: ён такі трук не можа прадэманстраваць.

Хочацца расказаць трошкі больш падрабязна пра нумар, які называецца «Паветраны палёт». І пра яго выканаўцаў. Іх сем чалавек: тры дзяўчыны, чатыры хлопцы. Чуюць адрывістая каманда «ап!», гімнаст ляціць да цэнтра залы на трапецыі, адрываецца ад яе, робіць сальта-мартале і тут жа двайны піруэт — няўжо ён падае? — але рукі партнёра падхопліваюць яго, лавітор і вальтыжор раскачваюцца разам, а потым чалавек-птушка нясецца далей, да мастка на процілеглым канцы залы. Праз мінуту адтуль узлятае ў паветра яшчэ адзін гімнаст і таксама ляціць над арэнаю, выконваючы сваю праграму палёту. Такі прыгожы гэты нумар і так ён уражвае, што міжволі падумаеш: не распаўсюджваецца на гэтых хлопцаў і дзяўчат суровы закон сусветнага прыцягнення, яны народжаны лятаць.

У нумара «Паветраны палёт» эфектная канцоўка. Выканаўцы падаюць адзін за другім у сетку. Апошняй адпускае перакладзіну пад самым купалам Ядвіга Кокіна. Ластаўкай нясецца яна ўніз і толькі ля самай сеткі складваецца, каб атрымалася «мяккая пасадка».

— Ядзя — чалавек выключнай мэтанакіраванасці, — расказвае кіраўнік выпускнога курса Марк Барысавіч Карабельнік. — Зрэшты, яны ўсе такія, нашы палётчыкі. Курс увогуле дружны, але гэтыя хлопцы і дзяўчаты — лепшыя з лепшых. Яны дружаць у паветры, дружаць і на зямлі. Атрымаюць дыпломы, паедуць разам працаваць. Куды? Куды пашлюць. Што будуць рабіць? Лятаць, вядома.

Наталля ВАСКРАСЕНСКАЯ,
(АДН).

Спрытныя дзявочыя пальцы, уважлівы погляд, пасма валасоў, мяккая ўсмешка. Гэта Лідзія Жывапісава, сартавальшчыца Добрушскага цэлюлозна-папяровага камбіната «Герой працы».

Памятайце — у сшытку, на якім вы пішаце, у кнізе, якую чытаеце, у альбоме для малявання і вучнёўскім дзённіку ёсць праца Лідзіі і соцень яе таварышаў. Гэта яны зрабілі маладым адно са старэйшых прадпрыемстваў рэспублікі — хутка яму споўніцца 100 гадоў.

Нядаўна на ўрачыстым сходзе Лідзіі Жывапісцавай і многім яе сябрам былі ўручаны дыпломы «Лепшаму маладому рабочаму».

...Ледзь чутна шастаюць старонкі. Наш няштатны фотакарэспандэнт Уладзімір Пратапопаў нават сваім фотаапаратам не змог адцягнуць увагі Лідзіі ад работы.

Фота Ул. ПРАТАПОПАВА.

ПАДАРУНАК АД СЯМ'І ПАЭТА-ВОІНА

Пошта ў адрас Гомельскага абласнога краязнаўчага музея ў гэты дзень была незвычайная. Сярод газет і шматлікіх канвертаў выклікала цікавасць акуратна запакаваная бандэроль.

У ёй аказаўся з любоўю афармлены альбом фатаграфій і фотакопій дакументаў пра ўзбекскага паэта-воіна Султана Джураева, які па-геройску загінуў 10 лістапада 1943 года пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Лоева.

На альбоме надпіс: «Гомельскаму абласному музею—ад сям'і Султана Джураева, гор. Андзіжан».

28 фотаздымкаў альбома расказваюць пра кароткае, але поўнае пошукаў жыццё паэта, пра яго шматгранную творчую і баявую дзейнасць.

Вось партрэт С. Джураева — на вас глядзіць валявы, мужны твар. Джураеў — у асяроддзі сваёй сям'і, сярод узнагароджаных ордэнамі пісьменнікаў Узбекістана ў 193... годзе... У альбоме ёсць таксама фотакопіі тытульных аркушаў зборнікаў твораў і рукапісаў паэта.

Заканчваецца альбом здымкам ордэна Вялікай Айчыннай вайны, якім пасмяротна быў узнагароджаны мужны воін і таленавіты паэт, сын сонечнага Узбекістана.

Свята захоўваюць памяць пра паэта ў Беларусі. У вёсцы Казярогі, цяпер Рэчыцкага раёна, дзе ў братняй магіле пахаваны ўзбекскі паэт, ёсць вуліца Джураеўская. У народным музеі Лоеўскай школы экспануюцца некаторыя асабістыя рэчы, дакументы і кнігі паэта.

М. ГАТОЎКІН,
супрацоўнік Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

19 ліпеня

Першая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—«Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 16.45—праграма перадач. 16.50—для школьнікаў і малодшых школьнікаў. В. Елісееў. «Сэмба». Спектакль Калінінскага тэатра лялек (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — для малышоў. «Балабок». Мультыплікацыйны фільм. 18.30—«Заўтра—у жыццё». Пра выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. 19.00—«Добры дзень, героі Брэста!». Выступленне старшыні штаба па шэфству над будаўніцтвам танкера «Героі Брэста» М. І. Кісловa. 19.20 — «Табе, юнацтва!». Перадача з Ленінграда. 19.50—«Гутаркі ля раяля». Фартэпіянная сюіта па сімфанічнай казцы С. Пракоф'ева «Пеця і воўк» (М). 20.30—тэлевізійныя навіны (М). 20.50—«Свет сёння» (М). 21.20—чэмпіянат свету па футболу. Партугалія—Бразілія. Перадача з Англіі.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20—«Паэзія». Літаратурны альманах (М). 19.00—эстрадны канцэрт. 21.20—«Царская нявеста». Мастацкі фільм.

20 ліпеня

Першая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—для тых, хто працуе ў другую змену. На чэмпіянаце свету па футболу (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50—для школьнікаў. «Так мы адпачываем». Перадача з Казані. 17.20—для малышоў. «Два прагныя мядзведзяняці». Мультыплікацыйны фільм. 17.30 —рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. «Хімія ў энергетыцы». Рэпартаж з перасоўнай Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі. 18.00—тэлевізійныя навіны. 18.20—да Дня адраджэння Польшчы. «Мелодыі над Віслай». Музычная перадача. 19.10—у эфіры — «Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда. 20.00—тэлевізійны тэатр мініяцюр. М. Фраці «Заява» (М). 20.30—тэлевізійныя навіны (М). 20.50 —Дзень салідарнасці з В'етнамам. Міжнародная праграма (М). 21.20 — чэмпіянат свету па футболу. СССР—Чылі. Перадача з Англіі. У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 23.15—дзённік V Усесаюзных студэнцкіх гульняў.

Другая праграма. 17.20— Пра тых, хто нас абслугоўвае». Пераклічка Масквы і Ленінграда. 18.00—«Панарама Радзімы» (М). 18.20—эстрадны канцэрт. Перадача з Кіева. 19.10 — «Кругасветная падарожжа». Мастацкі фільм. Дзецям да 16 год глядзець не дазваляецца. 20.45—«Сумленне не даруе». Тэлевізійны спектакль.

21 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15—для тых, хто працуе ў другую змену. На чэмпіянаце свету па футболу. СССР—Чылі (М). 16.45—праграма перадач. 16.50—для малышоў. «Мядзведзік Рымцімці». Лялечны спектакль (М). 17.30—«Канец чорнай багны». Мультфільм. 17.50—тэлевізійныя навіны. 18.10 — канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў піяніста В. Шацкага. 18.25—да Дня адраджэння Польшчы. «Маладосць у тысячу гадоў». 19.00—Д. К'юсак. «Гарачае лета ў Берліне». Спектакль Чялябінскага драматычнага тэатра імя Цвілінга. Перадача з Ленінграда. У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 21.30—«Экран нашых сяброў». Пра кінамастацтва Польшчы. 22.20—спявае Аскольд Бяседзін (М). 23.00—чэмпіянат свету па футболу. Венгрыя — Балгарыя (у запісе) (М).

Другая праграма. 17.30 — «Жыццё—подзвіг». Да 90-годдзя з дня нараджэння Ф. М. Пятрова (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. «Экран Вялікай хіміі» (М). 19.00—«Танец украінскага народа». Дакументальны фільм. 19.35—«Радавы Аляксандр Матросаў». Мастацкі фільм. 20.50—па родной краіне. «Ад Сухумі да Батумі». «Горад маёй вясны». Кінанарысы. 21.30—«Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М).

Літаратура і мастацтва 4

Аўторак, 19 ліпеня 1966 года

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ПАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць ў аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

СЕЛЬСКАЯ НОВЬ

Навукова-папулярны штомесячны часопіс цікавы не толькі для працаўнікоў вёскі, якія прачытаюць у ім пра лепшы вытворчы вопыт і прыёмы работы наватараў, але і для самага шырокага кола чытачоў.

Шмат цікавых звестак можна прачытаць у раздзелах «Пра ўсё патроху» і «Зрабі сам». З нумара ў нумар публікуюцца цікавыя факты з жыцця раслін і жывёл, парады садаводам-аматарам, практычныя парады хатнім гаспадыням, мадэлі адзення.

Цана аднаго нумара — 25 капеек.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 02547